Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

11 СНЕЖНЯ 2014 г. ЧАЦВЕР № 235 (27845) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Усё пра сямейны капітал**

СТАР. 2

Сямейная газета



**Наталля Гайда: пра творчы лёс і каханне**




**Як рыхтаваліся да Новага года ў СССР?**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Член Савета Еўразійскай эканамічнай камісіі ад Беларусі Сяргей РУМАС:**

*«Савет Еўразійскай эканамічнай камісіі пагадзіўся, што ва ўзнікненні праблемы незаконнага транзіту тавараў, якія трапілі пад расійскія санкцыі, віны беларускага боку няма, бо Беларусь строга выконвае ўсе ўзятыя на сябе абавязацельствы, у тым ліку і ў рамках Мытнага саюза. Ёсць нядобрасумленныя суб'екты гаспадарання, як у Расіі, так, напэўна, і ў Беларусі, якія скарысталіся сітуацыяй з увядзеннем расійскіх санкцый і сталі правозіць прадукцыю па нелегальных схемах».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 11.12.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 10850,00 | ■ |
| Еўра | 13440,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 200,50 | ▲ |
| Укр. грыўня | 694,62 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# Перадсвяточны карагод



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Вучні сярэдняй школы вёскі Варані Столінскага раёна адпачываюць, вучацца і папраўляюць здароўе ў санаторыі «Алеся».

■ Жыллё

# ГОД РАЎНАВАЖНАГА «КВАДРАТА»

## НАЛЕТА ЭКСПЕРТЫ ПРАГНАЗУЮЦЬ ІСТОТНУЮ АКТЫВІЗАЦЫЮ НА ДРУГАСНЫМ РЫНКУ СТАЛІЧНАГА ЖЫЛЛЯ

**Менавіта ў першай палове снежня вядомыя спецыялісты рынку жыллёвай нерухомасці пачынаюць аналізаваць папярэднія вынікі года. Таму днямі пачала распаўсюджвацца інфармацыя аб тым, што 2014 год стаў упершыню ўнікальным па сваёй цэнавай стабільнасці на жыллёвым рынку. Наш пастаянны эксперт з гэтым пасылам згодны толькі часткова. Зрабіць аналіз сітуацыі ў жыллёвай сферы сталіцы і «намаляваць» прагноз на год наступны карэспандэнту «Звязды» дапамагае наш пастаянны эксперт — кіраўнік агенцтва «БелЦТН», старшыня рады Беларускай асацыяцыі «Нерухомасць» Мікалай ПРАСТАЛУПАЎ.**

### Рынак «прасеў» на 11%

Назваць год цалкам стабільным сапраўды нельга. Калі ў першыя месяцы новага сезона ён практычна «стаяў», то ў жніўні назіраўся амаль ажыятажны попыт на маленькія кватэры. Ды і цэны за гэты час паціху вагаліся ў розныя бакі. Ваганні былі, але захоўвалася тэндэнцыя на плаўнае патанненне. За 11 месяцаў і 10 дзён сярэдні кошт квадратнага метра агульнай плошчы ў Мінску знізіўся з 1750 да 1650 долараў. Па году маем 6%, а за месяц — 0,5%. Нагадаю, што сёлета ў студзені наш эксперт прагназаваў падобнае патанненне ў межах 1%. Як бачым, спадар Прасталупаў з памерам патаннення крыху «пагарачыўся», але дакладна не памыліўся па кірунку.

Зараз паспрабуем разабрацца з аб'ёмамі здзелак. Нацыянальнае кадастравае агенцтва інфармуе нас, што летась на гэтую дату было зарэгістравана 12790 здзелак. Сюды ўваходзяць і дагаворы па набыцці кватэр у новабудоўлях, калі апошнія купляліся кліентамі праз жыллёвыя аблігацыі. Сёлета падобных здзелак было зафіксавана 11333, што на 1430 менш. Атрымліваецца, што сёлета актыўнасць рэальных пакупнікоў знізілася адразу на 11%. Чаму?

СТАР. 2

# СЯМЕЙНЫ КАПІТАЛ УЗАКОНЕНЫ

## З 1 СТУДЗЕНЯ 2015 ГОДА ЎСТАНАЎЛІВАЮЦЦА ДАДАТКОВЫЯ МЕРЫ ДЗЯРЖАЎНАЙ ПАДТРЫМКІ СЕМ'ЯЎ, ЯКІЯ ВЫХОЎВАЮЦЬ ДЗЯЦЕЙ

**Адпаведны ўказ № 572 Прэзідэнт Беларусі падпісаў 9 снежня, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.**

У прыватнасці, сем'ям будуць аднаразова прадастаўляцца безнаяўныя грашовыя сродкі ў суме $10 тыс. пры нараджэнні трэцяга або наступных дзяцей.

Правы на такі сямейны капітал маюць грамадзяне Рэспублікі Беларусь пры нараджэнні (усынаўленні) трэцяга або наступных дзяцей, якія нарадзіліся з 1 студзеня 2015 года да 31 снежня 2019 года.

Назначэнне сямейнага капіталу ажыццяўляецца пры звароце ў мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы. Правы на зварот за назначэннем сямейнага капіталу можа быць рэалізавана на працягу 6 месяцаў з дня нараджэння (усынаўлення) трэцяга і наступных дзяцей, а правы на распараджэнне сродкамі сямейнага капіталу — пасля 18 гадоў з даты нараджэння дзіцяці, у сувязі з нараджэннем, усынаўленнем (удачарэннем) якога сям'я набыла правы на назначэнне сямейнага капіталу.

Сродкі сямейнага капіталу могуць быць выкарыстаны на паляпшэнне жыллёвых умоў, атрыманне адукацыі, атрыманне паслуг у сферы сацыяльнага абслугоўвання, аховы здароўя, фарміраванне накапляльнай пенсіі маці. Пры гэтым сродкі сямейнага капіталу могуць быць выкарыстаны датэрмінова на атрыманне платных медыцынскіх паслуг, аказваемых арганізацыямі аховы здароўя, у парадку і па пераліку, вызначаемым Міністэрствам аховы здароўя.

Фінансаванне расходаў на выплату сямейнага капіталу ажыццяўляецца ў доларах ЗША.

Сродкі сямейнага капіталу, адносна якіх грамадзяне не звярнуліся на працягу 3 гадоў пасля 18 гадоў з даты нараджэння дзіцяці, у сувязі з нараджэннем, усынаўленнем (удачарэннем) якога сям'я набыла правы на назначэнне сямейнага капіталу, або нявыкарыстаныя на працягу 5 гадоў пасля падачы заявы аб распараджэнні імі, падлягаюць вяртанню ў рэспубліканскі бюджэт.

Устанаўліваецца таксама штомесячная дапамога на дзяцей ва ўзросце ад 3 да 18 гадоў сем'ям у перыяд выхавання дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў у памеры 50 працэнтаў найбольшай велічыні бюджэту пражытачнага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва, зацверджанага Мінпрацы і сацыяльнай абароны, за два апошнія кварталы.

У якасці бягучай падтрымкі сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей, указам прадугледжана, што правы на дапамогу маюць маці або бацька (усынавіцель, апякун), якія выхоўваюць адначасова дзяцей ва ўзросце да 3 гадоў і ад 3 да 18 гадоў і маюць правы на дапамогу па доглядзе дзіцяці да 3 гадоў. Пры назначэнні дапамогі не ўлічваюцца дзеці, якія знаходзяцца ў дзіцячай інтэрнатнай установе, установе адукацыі з кругласутачным рэжымам знаходжання.



Акрамя таго, указам устанаўліваецца працэнтная стаўка за карыстанне льготнымі крэдытамі на будаўніцтва (рэканструкцыю) або набыццё жылых памяшканняў маладым сем'ям, якія маюць дваіх непаўналетніх дзяцей на дату зацвярджэння спісаў на атрыманне льготных крэдытаў, у памеры 5 працэнтаў гадавых.

Дакументам зацверджаны Палажэнне аб аднаразовым прадастаўленні сем'ям безнаяўных грашовых сродкаў пры нараджэнні, усынаўленні (удачарэнні) трэцяга або наступных дзяцей, а таксама Палажэнне аб парадку назначэння і выплаты штомесячнай дапамогі сем'ям на дзяцей ва ўзросце ад 3 да 18 гадоў у перыяд выхавання дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў.

## НАВУКА АДКРЫТАСЦІ

**Працэдуры прысуджэння вучоных ступеняў доктара і кандыдата навук і прысваення вучоных званняў дацэнта і прафесара ў Беларусі прапануецца зрабіць максімальна адкрытымі. Гэта і іншыя прапановы па развіцці нацыянальнай сістэмы атэстацыі навуковых работнікаў абмяркоўваліся на сустрэчы Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі са старшынёй Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Генадзем Пальчыкам, паведамляе БЕЛТА.**

Камісія, як было даложана кіраўніку дзяржавы, падрыхтавала прапановы па двух напрамках. Адзін з іх датычыцца прысуджэння вучоных ступеняў доктара і кандыдата навук і прысвоення вучоных званняў дацэнта і прафесара. Прапануецца ўсю працэдуру абароны зрабіць максімальна адкрытай і даступнай для навуковай грамадскасці. Акрамя таго, камісія лічыць неабходным дэлегаваць вышэйшым навучальным установам, навуковым арганізацыям некаторыя паўнамоцтвы ў прысваенні вучоных званняў прафесара і дацэнта.

Яшчэ адна тэма, якая закраналася на сустрэчы, — праблемы сістэмы адукацыі і шляхі іх вырашэння, якія павінна прапанаваць узначаленая Генадзем Пальчыкам рабочая група.

Прэзідэнту таксама было даложана аб выніках работы ВАК за той час, што камісію ўзначальвае Генадзь Пальчык.

# ГОД РАЎНАВАЖНАГА «КВАДРАТА»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Агульная колькасць выстаўленых на продаж кватэр, па стане на 10 снежня, складае каля 7500 аб'ектаў. Сёння больш за палову гэтага жылля «завісае» ў каталогах на 6–7 месяцаў. Мікалай Прасталупаў тлумачыць гэта не толькі інертнасцю рынка, але і нежаданнем большасці прадаўцоў згаджацца з новай тэндэнцыяй і зніжаць кошты. А пакупнікі таксама не спяшаюцца, бо чакаюць з'яўлення адэкватных цэн, якія будуць адпавядаць існуючым даходам.

### Замежнікаў больш не стала

Вырашылі мы разабрацца і з тым, хто сёлета купляў у Мінску жыллё і па якім «сцэнары». Дык вось, як і раней, каля 90% усіх здзелак прыпадае на мінчан, якія адначасова купляюць і прадаюць жыллёвую нерухомасць. Астатнюю частку мясцовага жылля купляюць іншагароднія, з тым ліку іншаземцы. Па гэтым напрамку тэндэнцыя такая, што за мінулы перыяд пакупнікоў-украінцаў больш не стала. Больш за тое, за апошняе паўгоддзе кліенты з Расіі ўвогуле зніклі з беларускага рынку нерухомасці. І справа тут не толькі ў тым, што набываць цяпер у нас кватэры ім не выгадна (у буйных гарадах РФ жыллё ў доларах істотна патанела), а яшчэ і з прычыны зніжэння ўзроўню атрыманых даходаў, а таксама слабой упэўненасці звычайных расіян у заўтрашнім дні. Тут працуе яшчэ і псіхалагічны фактар, калі нашы суседзі пачалі «прытрымліваць» грошы на чорны дзень.

### Аднолькавы попыт на ўсе тыпы кватэр

Новай тэндэнцыяй апошніх двух месяцаў стала зніжэнне попыту на танныя маленькія кватэры. Цяпер у структуры рэальных здзелак толькі 40% тычыцца аднапакаёвых кватэр, а па 30% ад аб'ёму рынку прыпадае адпаведна на набыццё двух- і трохпакаёвага жылля. Нагадаю, што летам і ў першыя месяцы восені да 60% здзелак на рынку прыпадала менавіта на аднапакаёўкі.

Гэтая акалічнасць спрыяе сёння далейшаму зніжэнню цэннікаў на няякаснае маленькае жыллё ў старых дамах. Цяпер у гарадскім каталогу прапановы існуе невялікая колькасць варыянтаў аднапакаёвых кватэр коштам ад 45 да 50 тысяч долараў. Праўда за такія грошы вам прапануюць не зусім ліквідныя аб'екты з агульнай плошчай памяшканняў да 30 квадратных метраў. Падобнае слабенькае жыллё (плошчай да 36 «квадратаў») у спальных раёнах сталіцы выстаўляецца на продаж ужо па кошце ад 53 да 60 тысяч долараў. Сярэднім цэннікам па такіх бюджэтных кватэрах лічыцца дыяпазон ад 60 да 70 тысяч долараў. Разам з тым, максімальны кошт якасных аднапакаёвых кватэр дасягае 200–220 тысяч долараў.

**Новай тэндэнцыяй апошніх двух месяцаў стала зніжэнне попыту на танныя маленькія кватэры.**

Недзе з 55 тысяч пачынаецца кошт невялікіх двухпакаёвых кватэр. З цэннікам да 65 тысяч долараў магчыма адшукаць на рынку двухпакаёўкі плошчай да 46 «квадратаў». Стандартныя «двушкі» плошчай ад 43 да 55 квадратных метраў звычайна каштуюць ужо ў межах 65–75 тысяч долараў. Максімальная колькасць прапановы двухпакаёвых кватэр адпавядае цэнніку ад 75 да 90 тысяч долараў.

Мінімальны кошт трохпакаёвых кватэр складае каля 75 тысяч долараў. У гэтую катэгорыю трапляюць жылля памяшканні з агульнай плошчай ад 55 да 60 квадратных метраў. У падобных кватэрах звычайна сумежныя пакоі, і знаходзяцца такія памяшканні на крайніх паверхах пяціпавярховых дамоў. Сярэдні цэннік бюджэтных шматпакаёвых кватэр вагаецца ў межах ад 87 да 93 тысяч долараў. Стандартныя трохпакаёвыя кватэры плошчай да 70 квадратных метраў прапануюцца на другасным рынку па кошце ад 90 да 115 тысяч долараў.

### «Далёўка» таннее хутчэй

Цяпер на першасным рынку сталічнага жылля існуе шмат цікавых прапаноў і навагодніх акцый непасрэдна ад забудоўшчыкаў. Зразумела, што танней за ўсё на лініі долевага будаўніцтва прапануюцца кватэры ў дамах, узвядзенне якіх толькі арганізуецца на стадыі катлавана. Напрыклад, у будучым доме жылога комплексу па вуліцы Максіма Багдановіча квадратны метр агульнай плошчы прапануецца ўсяго па кошце ад 1200 долараў. Прапанова і сапраўды цудоўная, калі не ўлічваць той факт, што дом будзе здадзены ў эксплуатацыю не раней апошняга квартала 2016 года. Існуе ў гэтым комплексе і прапанова па жыллі, якое будзе пабудавана налета ў першым квартале. Праўда, у продажы засталася толькі вялікія па плошчы трохпакаёвыя кватэры, дзе кошт жыллёвага «квадрата» пачынаецца ад 1400 долараў. У жылым квартале па вуліцы Аэрадромная квадратны метр у двух-, чатырохпакаёвых кватэрах «сур'ёзных» плошчаў прапануецца ў межах ад 1450 да 1500 долараў. Але і тут існуе істотная дадатковая ўмова, бо на працягу 5-ці дзён трэба аплаціць 30–100% кошту кватэры. А будаўніцтва тут будзе завершана ў чэрвені 2015 года.

Гэтымі днямі адна камерцыйная кампанія зладзіла святочную акцыю па продажы невялікіх кватэр у жылым комплексе «Вясёлка», які знаходзіцца на адлегласці 8 кіламетраў ад МКАДа, у гарадку Прылукі. Кошт квадратнага метра аднапакаёвых кватэр у гэтым комплексе па акцыі складзе 1100 долараў, а па двухпакаёвых кватэрах — 995 долараў.

**• Даведка**

*Паводле інфармацыі начальніка ўпраўлення жыллёвай палітыкі Мінгарвыканкама Аляксандра Аўраменкі, на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў у горадзе стаіць 235 тысяч сем'яў і грамадзян. Да апошніх гадоў «інвентарызацыю» жыллёвай чаргі рабілі раз на пяць гадоў. Цяпер яе правяраюць штогод. Толькі летась падчас зверкі чаргі з адпаведнага ўліку была знята каля 31 тысячы чалавек. Галоўным чынам зверка закранула інтарэсы тых чаргавікоў, якія лічыліся маючымі патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў яшчэ па старым заканадаўстве.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**• Даведка**

***Цяпер у сталіцы права на атрыманне льготнага крэдыту для будаўніцтва жылля маюць тыя, хто знаходзіўся ў жыллёвай чарзе з 1988–1989 гадоў. Разам з тым на працягу апошніх 1,5–2 гадоў у спісы на атрыманне льготных крэдытаў практычна не трапляюць тыя, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў па агульнай чарзе. Перавага даецца выключна шматдзетным, сіротам, вайскоўцам, суддзям і тым, хто пражыў у інтэрнатах больш за 10 гадоў.***

Даволі істотнае патанненне жыллёвага «квадрата» напрыканцы года тлумачыцца тым, што ў камерцыйных арганізацыях у гэты перыяд міжсезоння не хапае абаротных сродкаў для працягвання далейшага будаўніцтва. Вось асобныя камерцыйныя структуры і пачынаюць «цыраваць дзіркі» праз механізм прыцягвання сродкаў ад кліентаў.

### Налета не выключаецца сур'ёзнае патанненне

Істотных змен у цэнавым дыяпазоне на другасным рынку жылля да Новага года Мікалай Прасталупаў не чакае. Перадумоў да гэтага няма ніякіх. Нават калі нешта і адбудзецца, то інерцыйны рынак нерухомасці проста не паспее на гэта адрэагаваць.

Практычна ўсе ўдзельнікі рынку з вялікай зацікаўленасцю чакаюць студзеня. Па-першае, у гэты час на тэрыторыі трох суседніх дзяржаў пачнуць дзейнічаць агульныя правілы гульні пад эгідай ЕАЭС. Як гэта адгукнецца на рынку нерухомасці, нават спецыялісты не ведаюць. Гэта пра доўгатэрміновую перспектыву.

Звычайных шараговых практыкаў сёння больш цікавіць пытанне магчымай дэвальвацыі айчыннай валюты ў дачыненні да долара. На працягу года інфляцыя па будматэрыялах і энерганосьбітах рухалася ўгору, а курс замежнай валюты рос значна слабей. Да таго ж сітуацыя з коштам валюты ў Расіі прыводзіць да таго, што беларускія тавары робяцца не зусім канкурэнтнымі на гэтым вялікім суседнім рынку. Вырашэнне падобнай эканамічнай задачы па паляпшэнні сітуацыі ў знешнім гандлі можа (павінна. — **Аўт.**) падштурхнуць айчынных эканамістаў да правядзення сур'ёзнай дэвальвацыі, лічыць наш эксперт. Пры падобным развіцці падзей спадар Прасталупаў прадугледжвае некалькі варыянтаў. Калі айчынная валюта патаннее адразу на мінімум 30%, то ўжо праз месяц, максімум два, цэннікі ў замежнай валюце на нерухомасць знізяцца прыкладна на 10–15%. Пасля падобнай падкарэкцыроўкі рынак звычайна адразу ажывае. Пасля чаго павялічваецца колькасць здзелак куплі-продажу любых кватэр нават на другасным жыллёвым рынку. А гэта для агенцтваў, ды і для нашай эканомікі, будзе плюсам, лічыць эксперт. А вось калі з курсам долара ўсё застанецца «па-старому», то і кошты на жыллё ў сталіцы будуць зніжацца тэмпам, не большым за 0,5% за месяц.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# «Мінімалка» падрасце

**З 1 студзеня 2015 года месячная мінімальная заработная плата (МЗП) устаноўлена ў памеры Br2 млн 100 тыс. 100. Такое рашэнне змяшчаецца ў пастанове Савета Міністраў ад 9 снежня 2014 г. №1151, паведамляе БЕЛТА.**

Мінімальная заработная плата (месячная і гадзінная) — дзяржаўны мінімальны сацыяльны стандарт у галіне аплаты працы, які наймальнік абавязаны ўжываць у якасці ніжэйшай мяжы аплаты працы работнікаў за працу ў нармальных умовах на працягу нармальнай працягласці працоўнага часу пры выкананні абавязкаў работніка, лакальных нарматыўных прававых актаў і працоўнага дагавора.

З 4 жніўня 2014 года ўступіла ў сілу новая рэдакцыя закона «Аб устанаўленні і парадку павышэння мінімальнай заработнай платы». У адпаведнасці з ёй памер гадзіннай мінімальнай заработнай платы вызначаецца наймальнікам шляхам дзялення памеру месячнай МЗП на суадносіны разліковай нормы працоўнага часу каляндарнага года, усталяванай для адпаведных катэгорый работнікаў наймальнікам, і колькасці месяцаў каляндарнага года. Ён змяняецца наймальнікам пры змене памеру месячнай мінімальнай заработнай платы, у тым ліку ў сувязі з індэксацыяй МЗП.

Месячная мінімальная заработная плата на працягу года падлягае індэксацыі ў парадку, прадугледжаным для індэксацыі даходаў, атрыманых з бюджэтных крыніц, у адпаведнасці з заканадаўствам аб індэксацыі даходаў насельніцтва з улікам інфляцыі.

Работніку, у якога памер налічанай заработнай платы апынуўся ніжэйшым за памер МЗП (месячнай і пагадзіннай), наймальнік абавязаны зрабіць даплату да памеру МЗП.

З 1 студзеня 2014 года месячная мінімальная заработная плата была ўстаноўлена ў памеры Br1 млн 660 тыс. Памер МЗП праіндэксаваны за кастрычнік гэтага года на 13%, разлічаных нарастаючым вынікам да студзеня 2014-га, такім чынам, у кастрычніку гэтага года МЗП складала Br1 млн 841 тыс. 483.

■ Па той бок прылаўка

## ЦЭНАМ — СТАЯЦЬ, НЕ РУХАЦЦА!

**Міністэрства гандлю ўвяло мараторый на рост цэн да 15 студзеня 2015 года.**

Зроблена гэта з улікам прынятага Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь Указа ад 5 снежня 2014 года №567 «Аб дадатковых мерах па абароне правоў спажыўцоў». Мінгандлю прадпісала галіновым міністэрствам, канцэрнам, абласным і Мінскаму гарадскому выканкамам аб'явіць маратoрый на павелічэнне адпускных і рознічных цэн на спажывецкія тавары ў перадсвяточныя і святочныя дні. За незахаванне парадку цэнаўтварэння, а таксама заканадаўства аб гандлі і грамадскім харчаванні (рэалізацыя пратэрмінаваных ці няякасных тавараў, незахаванне рэжыму працы аб'екта, асартыментнага пераліку, падман пакупнікоў і г.д.) да парушальнікаў будуць прымацца самыя жорсткія меры, прадугледжаныя Указам №567, уключна да закрыцця гандлёвых аб'ектаў, аб'ектаў грамадскага харчавання, падкрэслілі ў міністэрстве.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■ На дарожку

# ЧАМУ Ў МЕТРО ЗАБАРАНІЛІ ХАДЗІЦЬ БАСАНОЖ?

## Уступілі ў сілу новыя правілы перавозак пасажыраў гарадскім электратранспартам і метрапалітэнам. У самых цікавых нюансах паспрабавала разабрацца «Звязда»



Фота БЕЛТА.

**Транспартнікі ў правілах перавозак прапісалі наяўнасць у тралейбусах і трамваях валідатараў, выкарыстанне электронных квіткоў і некаторыя асаблівасці паводзін у метрапалітэне. І калі адны з новаўвядзенняў, выкліканыя рэальнымі зменамі ў практыцы пасажыраперавозак (тыя ж валідатары), амаль не прыцягнулі ўвагі грамадскасці, то іншыя (напрыклад, забарона знаходжання на станцыі метро ў навушніках) ускалыхнулі народныя масы. На форумах закіпела незадаволенасць...**

### ШТО Ж ТАКОЕ ВАЛІДАТАР?

Правілы перавозак пасажыраў гарадскім электратранспартам і метрапалітэнам зацверджаны Пастановай Савета Міністраў ад 22 лістапада 2014 года №1088, а днямі яны былі афіцыйна апублікаваны на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале. Апошні факт сведчыць аб тым, што правілы ўжо ўступілі ў сілу. Так, цяпер паняцце «валідатар» з'явілася ў гарадскім электратранспарце і метрапалітэне цалкам афіцыйна. Тлумачыцца, што гэта прылада, прызначаная для пацвярджэння пасажырам аплаты праезду з дапамогай электроннага білета. Важна ведаць, што можа лічыцца пацвярджэннем аплаты праезду: «купля білета рулоннага тыпу» або наяўнасць талона з адзнакай кампосцера, або наяўнасць электроннага білета з адзнакай у валідатары — усё залежыць ад тэхналогіі, якая прымяняецца.

Нехта, уважліва прачытаўшы правілы, занепакоіўся тым, што там нічога не сказана пра набыццё білета ў тралейбусе або трамваі ў кіроўцы, не запісана гэта і ў абавязках апошняга. Маўляў, ёсць верагоднасць, што з часам з купляй талончыка ўзнікнуць складанасці. Аднак ніякіх падстаў для перажыванняў няма. Як патлумачылі нашаму карэспандэнту ў Мінсктрансе, продаж білетаў кіроўцам — гэта рабочы момант, які не павінен быць асобна прапісаны.

### МЕТРО НЕ ДЛЯ РАМАНТЫКІ

Прайсціся басанож па горадзе — троху хуліганскі, а для многіх рамантычны ўчынак. Часта можна ўбачыць у сталіцы, падчас моцных летніх ліўняў, людзей, якія ідуць па лужынах без абутку, трымаючы яго ў руках. Нічога тут, здаецца, небяспечнага няма. Але толькі да таго моманту, пакуль у такім выглядзе чалавек не заходзіць на станцыю метро. «Там жа ўсё аздоблена мармурам. А нам вельмі лёгка пакаўзнуцца, ідучы басанож па мокрай паверхні. Тое самае часта адбываецца і зімой, калі на боты наліпае снег», — каментуе забарону на знаходжанне на станцыі метро без абутку Андрэй Кузьмін, прэс-сакратар Мінскага метрапалітэна. Таму такое рашэнне прадыктавана выключна клопатам пра бяспеку пасажыраў. Тое, што выпадкі «коўзання» па станцыі метро — не выдумка, я, між іншым, адчуў на ўласнай скуры. Паплаціўся адночы зімою за неасцярожнасць пераломам нагі.

Вельмі ўзрушана ўспрынялі людзі навіну і пра тое, што ў навушніках на платформе метрапалітэна, калі гэта не слыхавы апарат, таксама знаходзіцца нельга. Але Андрэй Кузьмін патлумачыў, што і гэтыя захад накіраваны на бяспеку і зручнасць для пасажыраў: «Людзі ў навушніках не чуюць аб'яў і паведамленняў. У выніку яны не ведаюць, што цягнік, які пад'язджае да станцыі, спыняцца не будзе, што нейкая станцыя закрыта або што цягнік ідзе толькі да пэўнай станцыі, а не да канца маршруту. Потым атрымліваецца, што пасажыры заязджаюць у дэпо ці праязджаюць міма сваёй станцыі. І ўрэшце, гэтыя людзі скардзяцца на метрапалітэн».

### НА СТАНЦЫЮ МОГУЦЬ НЕ ПУСЦІЦЬ

Асобны пункт у правілах прысвечаны агляду пасажыраў. Паведамляецца, што менавіта работнік службы бяспекі перавозчыка абавязаны паведамляць пасажыру, якога хоча агледзець, і якія правы пры гэтым мае пасажыр. «Асобе, што адмовілася даць работнікам службы бяспекі перавозчыка змесціва ручной паклажы для правядзення аглядных мерапрыемстваў, можа быць адмоўлена ў прадастаўленні паслугі па перавозцы», — сказана ў правілах. Андрэй Кузьмін заявіў, што новымі гэтыя палажэнні назваць нельга. Гэта даўно зацверджана іншымі дакументамі. Прэс-сакратар пацвердзіў, што пасажыра могуць не пусціць на платформу метро, калі ён не хоча паказваць змесціва торбы. Як і чалавека ў нецвярозым стане.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ**

## ХАКЕЙНУЮ ЗБОРНУЮ ЎЗНАЧАЛІЦЬ КАНАДЗЕЦ?

**Федэрацыя хакея Беларусі паведаміла, што асноўным кандыдатам на пасаду галоўнага трэнера зборнай з'яўляецца 61-гадовы канадзец Дэйв Льюіс. Заакіянскі спецыяліст у бліжэйшы час мусіць прыбыць у Мінск для падпісання кантракта.**



Яго імя добра вядомае ў НХЛ. На пазіцыі абаронцы Дэйв правёў больш за 1000 матчаў у лепшай хакейнай лізе планеты. Выступаў за «Нью-Ёрк Айлендэрс», «Лос-Анджэлес Кінгз», «Нью-Джэрсі Дэвілз». Узначальваў «Дэтройт», «Бостан Бруінз», зборную Украіны. У свой час Льюіс таксама ўваходзіў у трэнерскі штаб зборнай Беларусі, дзе па чарзе дапамагаў Глену Хэнлану і Міхаілу Захараву.

**Тарас ШЧЫРЫ.**

## «Фаніў» лом металаў...

**Пры праверцы лому каляровых металаў на ААТ «Белкалермет» у Гатава Мінскага раёна было выяўлена перавышэнне радыяцыйнага фону.**

«Фаніла» ад змесціва кузава аўтамабіля «ЗІЛ», дзе знаходзіўся алюміній, дробныя запчасткі ад прыбораў. Спецыялісты службы хімічнай і радыяцыйнай абароны Рэспубліканскага атрада спецыяльнага прызначэння МНС устанавілі, што перавышэнне радыяцыйнага фону на паверхні было ў 40 разоў. Праведзены спектральны аналіз крыніцы іанізуючага выпрамянення паказаў, што гэтым рэчывам мог з'яўляцца радый. Быў знойдзены фрагмент прыбора памерамі 10 на 15 см, які і «фаніў». Яго змясцілі ў герметычны кантэйнер для наступнай утылізацыі. Ніхто не пацярпеў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# Гандлявалі чыёйсьці адвагай...

**Супрацоўнікі пункта мытнага афармлення «Мінская пошта» Мінскай рэгіянальнай мытні выявілі спробу перамяшчэння праз мяжу Мытнага саюза нагрудных знакаў, якія ўяўляюць гісторыка-культурную каштоўнасць: ардэна і васьмі медалёў савецкага перыяду.**



Яны былі знойдзены ў двух міжнародных паштовых адпраўленнях, якія ішлі з Украіны на адрас атрымальніка, што пражывае ў Баранавічах. У дробных пакеты былі ўкладзены ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга з ордэнскай кніжкай і восем медалёў «За адвагу». Мытныя дэкларацыі адсутнічалі. Укладанні, згодна з заключэннем эксперта, з'яўляюцца арыгінальнымі дзяржаўнымі ўзнагародамі СССР і ўяўляюць гісторыка-культурную каштоўнасць.

— Гэта ўжо не першы выпадак спробы перамяшчэння праз мяжу Мытнага саюза культурных і гістарычных каштоўнасцяў праз паштовую сувязь. Напрыклад, у кастрычніку мінулага года мінскімі мытнікамі было выяўлена 27 узнагарод тых жа савецкіх часоў, — расказала галоўны інспектар аддзела ідэалагічнай работы Мінскай рэгіянальнай мытні Настасся Нянашава. — Тады эксперты ацанілі знаходку больш чым у 25 мільёнаў рублёў. Кошт выяўленых цяпер дзевяці нагрудных знакаў удакладняецца, аднак вядома, што на інтэрнэт-аўкцыёнах яна вар'іруецца ад 35 да 90 долараў за штуку.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## Знайшоў псіхатроп і... пакаштаваў

**На станцыі метрапалітэна «Кастрычніцкая» быў затрыманы 17-гадовы мінчанін.**

Хлопец стаяў каля краю платформы і хістаўся, распавялі ва УУС па ахове метрапалітэна. Пры асабістым даглядзе ў яго знайшлі поліэтыленавы пакецік з рэчывам расліннага паходжання карычневага колеру вагой каля чатырох грамаў. Як пазней было выяўлена, гэта быў асабліва небяспечны псіхатроп. Па словах маладога чалавека, падобныя рэчывы ён ніколі раней не ўжываў. Пакецік быццам бы знайшоў на вуліцы, пасля чаго дзеля цікавасці вырашыў... пакаштаваць яго змесціва. Цяпер дзеяннем затрыманага даецца прававая ацэнка.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа»

**ПРИГЛАШАЕТ ПРИНЯТЬ УЧАСТИЕ В ПРОЦЕДУРЕ ПЕРЕГОВОРОВ**

**по текущему ремонту помещений в здании биржи со сменой керамической плитки (67,12 м.кв.), заменой водопроводных труб (8 м.п.), окраской стен (40,6 м.кв.).**

Со сметной документацией можно ознакомиться по адресу: **г. Минск, ул. Сурганова, 48А, тел. 296-68-27.** Просим сообщить о своем намерении участвовать в переговорах **не позднее 10.00.16.12.2014.**

УНП 101541722

**Смолевичский районный исполнительный комитет**

СООБЩАЕТ ОБ ОТКАЗЕ ОТ ПРОВЕДЕНИЯ АУКЦИОНА на право заключения договора аренды земельного участка 30 декабря 2014 г. в 11.00 для строительства и обслуживания многоквартирного жилого дома в аг. Слобода, ул. Машерова Озерицко-Слободского сельсовета Смолевичского района Минской области.

УНП 600014139

**Считать недействительными** страховые полисы по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БМ № 0578514, 0578515.




# РАТАЎНІКАМ ДАПАМОГУЦЬ ПЕРСАНАЖЫ КАЗАК

## Як бяспечна сустрэць Новы год, раскажуць 23 снежня ў рэзідэнцыі Дзеда Мароза

**У снежні ў Беларусі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях праводзіць акцыю «Бяспечны Новы год». Не сакрэт, што менавіта на гэтыя дні прыпадае больш за ўсё выклікаў ратаўнікоў: да халадоў далучаюцца святочныя бяседы і канікулы ў школьнікаў, не кажучы ўжо пра масавае захапленне піратэхнікай. Сёлета да прафілактычнай акцыі падключыцца і беларускі Дзед Мароз.**

— Напрыканцы года ў госці ў рэзідэнцыю Дзеда Мароза ў Белавежскай пушчы прыязджае вельмі шмат людзей. Таму 23 снежня, якраз напярэдадні доўгіх зімовых канікул, мы будзем расказваць, як жа бяспечна сустрэць і правесці навагоднія святы,— паведаміла «Звяздзе» **намеснік начальніка аддзела прапаганды бяспекі жыццядзейнасці Цэнтра даследаванняў у галіне бяспекі жыццядзейнасці і ўзаемадзеяння з грамадскасцю Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Іна ЧУГАЙ.**— Госці, якія завітаюць да нас у гэты дзень, убачаць шмат цікавых інтэрактыўных конкурсаў і віктарын. Іх падрыхтавалі і правядуць супрацоўнікі МНС і валанцёры з ліку ратаўнікоў-актывістаў Беларускай маладзёжнай грамадскай арганізацыі ратаўнікоў-пажарных. Паўдзельнічаць у іх змогуць не толькі дзеці, але і бацькі. Апроч таго, мы ўзялі на ўзбраенне і адзін цікавы псіхалагічны момант. Усе мы ведаем, што дзеці вераць казачным персанажам. Таму Снягурка, Баба Каргота, сам Дзед Мароз і іншыя героі беларускіх народных казак будуць актыўна дапамагаць нашым валанцёрам.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

# МАЛАДЫЯ ЛЮДЗІ ЎЖЫВАЛІ СПАЙС ПРЫ ДВУХГАДОВЫМ ДЗІЦЯЦІ

## ГОСЦЬ «ВЫЙШАЎ» У АКНО, ГАСПАДАР НІЧОГА НЕ ПАМЯТАЕ

**…З кватэры на першым паверсе дома па вуліцы Волаха даносіўся гучны плач дзіцяці. Аднак дзверы ніхто не адчыняў, хоць у жыллі дакладна павіны былі быць дарослыя. Неабыякавыя людзі патэлефанавалі ў міліцыю.**

Не паспелі праваахоўнікі разам з медыкамі прыбыць на месца, як акно кватэры расчынілася і адтуль… «прагулачным» крокам «выйшаў» малады чалавек. Балазе падаконнік знаходзіўся не вельмі высока і, неўзабаве ўпаўшы, ён нават не атрымаў нейкіх сур'ёзных траўмаў. Дзякуючы адчыненаму акну міліцыянеры змаглі трапіць у кватэру, дзе ўбачылі маленькую дзяўчынку, якая плакала, знаходзячыся на жываце яшчэ аднаго маладога чалавека. Той ляжаў на канапе з выцягнутымі па швах рукамі і адсутным позіркам. Ні плач дзіцяці, ні з'яўленне праваахоўнікаў ніяк не змянілі паводзіны грамадзяніна. Хлопец, як высветлілася, быў дзядзькам дзяўчынкі, якога пакінулі наглядаць за дзіцем.

Паводле інфармацыі Маскоўскага РУУС г. Мінска, у здымнай кватэры пражывалі муж з жонкай і двухгадовай дачкой, а таксама 17-гадовы брат маладой жанчыны. Маці дзіцяці па стане здароўя знаходзілася ў бальніцы, а яе сужэнец адсутнічаў некалькі гадзін па справах працы. З дзяўчынкай папрасілі пабыць маладога дзядзьку. А той, не доўга думаючы, запрасіў у госці прыяцеля. Апошні прынёс з сабой курыцельную сумесь. Пад уздзеяннем псіхатропу госця і пацягнула «на прагулку» праз акно… Апошняе, што запомніў дзядзька дзяўчынкі,— гэта тое, што ён узяў яе на рукі…

Паколькі маладыя людзі ўжывалі спайс у прысутнасці дзіцяці, дзяўчынцы давялося дыхаць псіхатропным дымам, таму яе на ўсялякі выпадак тут жа даставілі ў бальніцу.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# Піратэхніка павінна прыносіць радасць, а не праблемы

**За першы тыдзень месяца супрацоўнікі міліцыі канфіскавалі з незаконнага абарачэння каля 40 тысяч адзінак нелегальнай піратэхнікі.**



— З набліжэннем калядных і навагодніх свят традыцыйна павялічваецца попыт на піратэхнічныя вырабы. У сувязі з гэтым актывізуецца іх нелегальны ўвоз у краіну і далейшая рэалізацыя. Напрыклад, летась з пачатку снежня і да заканчэння калядных свят было спынена больш за 60 фактаў рэалізацыі піратэхнікі, канфіскавана каля мільёна няякасных петардаў, феерверкаў і салютаў. За гэты час было зарэгістравана 28 фактаў траўматызму грамадзян. Толькі ў Мінску ў навагоднюю ноч ад піратэхнікі пацярпела двое падлеткаў і пяцёра дарослых,— нагадалі ў Міністэрстве ўнутраных спраў.

Трэба памятаць, што сертыфікаваныя піратэхнічныя вырабы можна набыць толькі ў спецыялізаваных крамах і аддзелах. Пры гэтым продаж такога тавару асобам, якім менш за 15 гадоў, забаронены. У мэтах уласнай бяспекі не варта купляць піратэхніку з рук, арганізоўваць феерверкі ў хатніх умовах, а таксама дазваляць дзецям самастойна забаўляцца падобным чынам. Небяспечна выкарыстоўваць феерверкі са скончаным тэрмінам прыдатнасці, а таксама калі яны маюць пашкоджанні корпуса ці кнота.

За нелегальны гандаль піратэхнікай пагражае штраф да 100 базавых велічынь (15 мільёнаў рублёў) з канфіскацыяй тавару, а таксама даходу, атрыманага ад яго рэалізацыі. Выкарыстанне піратэхнікі ў грамадскіх месцах можа быць расцэнена як дробнае хуліганства, за якое прадугледжаны штраф да 30 базавых велічынь (4,5 мільёна рублёў) ці адміністрацыйны арышт на тэрмін да 15 сутак. У выпадку нанясення значнай шкоды здароўю ці маёмасці навакольных наступае, у тым ліку, і крымінальная адказнасць.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# КУРЫЛЬШЧЫК «ДАПАЛІЎ» КАНАПУ

**У адной сталічнай кватэры з розніцай у дзве гадзіны адбыліся два пажары. У абодвух выпадках прычына была аднолькавая — курэнне нападпітку сына гаспадыні жылля.**

Першы раз сталічным выратавальнікам давялося выязджаць на вуліцу Чайлыткі пасля дзевяці гадзін вечара. У аднапакаёвай кватэры на чацвёртым паверсе дзевяціпавярховага дома тлела пасцельная бялізна на канапе. Яшчэ да прыбыцця работнікаў МНС жыхары самі залілі мэблю вадой. Прычынай здарэння стала непатушаная нецвярозым 49-гадовым сынам гаспадыні кватэры цыгарэта. Выратавальнікі добра залілі вадой канапу, каб пераканацца, што ачаг патушаны. А менш чым праз дзве гадзіны яны былі вымушаны вярнуцца ў тую ж кватэру. На гэты раз без сур'ёзных наступстваў ужо не абышлося. У прыватнасці, тая самая канапа выгарала цалкам. Паводле інфармацыі Мінскага гарадскога ўпраўлення МНС, было відавочна, што пажар пачаўся... з другога боку мяккай мэблі. Курыльшчыку было няўтульна сядзець на мокрым месцы, затушаным у першы раз, і ён перасеў на сухі бок канапы...

Выратавальнікі нагадваюць, што, паводле статыстыкі, амаль 90 працэнтаў пажараў у жыллі ўзнікае па віне нецвярозых курыльшчыкаў. І часта найперш яны самі становяцца ахвярамі агню. На гэты раз віноўніку пажараў пашчасціла. Толькі ці зробіць ён правільныя высновы?..

**Сяргей РАСОЛЬКА.**


# ОАО «Дорстройиндустрия»

## извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества

| Лот № 1 | Участок «Загуздье» | Витебская обл., Городокский р-н, Вировлянский с/с, д. Вировля, участок «Загуздье» | Начальная цена с НДС, бел. руб. | Задаток с НДС, бел. руб. | Шаг аукциона, % |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | 77 910 991 | 7 791 099 | 5 |

**ОПИСАНИЕ**

1. **Здание мастерской, инв. № 201/С-837**. Этажей – 2. Площадь – 587 м². Г.п. – 1994. 2. **Насосная, инв. № 201/С-10545**. Этажей – 1. Площадь – 47,5 м². Г.п. – 1994. 3. **Склад, инв. № 201/С-10544**. Этажей – 1. Площадь – 435,6 м². Г.п. – 1994. 4. **Здание административно-хозяйственное, инв. № 201/С-10540**. Этажей – 2. Площадь – 513 м². Г.п. – 1994. 5. **Здание котельной с металлической трубой, инв. № 201/С-824**. Этажей – 1. Площадь – 154 м². Г.п. – 1994. 6. **Весовая, инв. № 201/С-10542**. Этажей – 1. Г.п. – 1994. Площадь – 128,4 м². 7. **Корпус грохочения с галереей, инв. № 201/С-838**. Этажей – 1. Площадь – 1048 м². Г.п. – 1994. 8. **Трансформаторная, инв. № 201/С-10543**. Этажей – 1. Площадь – 52,3 м². Г.п. – 1994. 9. **Корпус третичного дробления, инв. № 201/С-10541**. Этажей – 1. Площадь – 192 м². Г.п. – 1994. 10. **Корпус вторичного дробления с тремя галереями, инв. № 201/С-836**. Этажей – 1. Площадь – 784 м². Г.п. – 1994. 11. **Корпус первичного дробления с галереей, инв. № 201/С-839**. Этажей – 1. Площадь – 427 м². Г.п. – 1994. 12. **Очистные сооружения, инв. № 201/С-11125**. Ввод в эксплуатацию – 1994. Площадь – 52 м². 13. **Артскважина бесфильтровая, инв. № 201/С-11133**. Ввод в эксплуатацию – 1994. Площадь – 3,1 м². Глубина скважины – 86 м. 14. **Ограждение металлическое, инв. № 201/С-11134**. Ввод в эксплуатацию – 1994. Площадь – 66,3 м². 15. **Водонапорная башня, инв. № 201/С-11127**. Ввод в эксплуатацию – 1994. Площадь – 1,5 м². Высота башни – 11,5 м. 16. **Емкость металлическая для дизельного топлива, инв. № 201/С-11120**. Ввод в эксплуатацию – 1988. Площадь – 5 м². Объем – 16 м³. 17. **Емкость металлическая для дизельного топлива, инв. № 201/С-11122**. Ввод в эксплуатацию – 1988. Площадь – 5 м². Объем – 16 м³. 18. **Емкость металлическая для дизельного топлива, инв. № 201/С-11119**. Ввод эксплуатацию – 1986. Площадь – 5 м². Объем – 16 м³. 19. **Емкость металлическая для дизельного топлива, инв. № 201/С-11121**. Ввод в эксплуатацию – 1986. Площадь – 5 м². Объем – 16 м³. 20. **Емкость металлическая для бензина, инв. № 201/С-11123**. Ввод в эксплуатацию – 1988. Площадь – 4,5 м². Объем – 14 м³. 21. **Емкость металлическая для бензина, инв. № 201/С-11124**. Ввод в эксплуатацию – 1988. Площадь – 4,5 м². Объем – 14 м³. 22. **Противопожарный резервуар железобетонный, инв. № 201/С-11126**. Ввод в эксплуатацию – 1994. Площадь – 60 м². Объем – 150 м³. 23. **Сети электроснабжения, инв. № 201/С-11131**. Год прокладки – 1994. Площадь – 35 м². 24. **Слаботочные сети, инв. № 201/С-11132**. Ввод в эксплуатацию – 1994. Площадь – 85 м². 25. **Водопроводная сеть, инв. № 201/С-11130**. Ввод в эксплуатацию – 1994. Площадь – 420 м². 26. **Канализационные сети, инв. № 201/С-11129**. Ввод в эксплуатацию – 1994. Площадь – 258 м². 27. **Тепловая сеть, инв. № 201/С-11128**. Ввод в эксплуатацию – 1994. Площадь – 22 м². 28. **Трансформатор ТМГ 400 10/04**, инв. № 9438.

**ЗЕМЕЛЬНЫЙ УЧАСТОК**

Земельный участок площадью 10,6612 га с кадастровым номером 221881801101000001. Целевое назначение – земельный участок для размещения объектов промышленности. Право постоянного пользования. Ограничения (обременения) прав в использовании земель, находящихся в охранных зонах линий электропередачи напряжением свыше 1000 В., площадь 0,2483 га. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

| Лот № 2 | Производственная база «Омневичи» | Брестская обл., Барановичский р-н, Почаповский с/с, 1, 2, 3, 4, 6, 7, 2,2 км северо-восточнее д. Застаринье | Начальная цена с НДС, бел. руб. | Задаток с НДС, бел. руб. | Шаг аукциона, % |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | 590 561 024 | 59 056 610 | 5 |

**ОПИСАНИЕ**

1. **Производственно-бытовой корпус, инв. № 110/С-89031.** Этажей – 2 (подземных – 1). Площадь – 974,4 м². Г.п. – 1975. 2. **Склад для хранения инвентаря, инв. № 110/С-89027**. Этажей – 1. Площадь – 92,4 м². Г.п. – 1976. 3. **Склад материалов, инв. № 110/С-89025.** Этажей – 1. Площадь – 273 м². Г.п. – 1978. 4. **Электрощитовая, инв. № 110/С-89023.** Этажей – 2. Площадь – 43 м². Г.п. – 1976. 5. **Заправочная ГСМ, инв. № 110/С-89021**. Этажей – 1. Площадь – 7 м². Г.п. – 1976. 6. **Помещение сторожки, инв. № 110/С-96848**. Этажей – 1. Площадь – 16,1 м². 7. **Эстакада для осмотра и ремонта автотранспорта, инв. № 110/С-97555.** Площадь – 81,2 м². Ввод в эксплуатацию – 1986. 8. **Труба дымовая, инв. № 110/С-94198.** Высота – 28 м. 9. **Пожарный резервуар, инв. № 110/С-94200**. Объем – 16 м³. Ввод в эксплуатацию – 1976 г. 10. **Линия электропередачи, инв. № 110/С-94197**. Протяженность – 1 800 м. Ввод в эксплуатацию – 1976 г. Составные части и принадлежности: линия электропередачи состоит из провода и двадцати пяти опор. 11. **Линия электропередачи, инв. № 110/С-94377**. Протяженность – 10 247 м. Ввод в эксплуатацию – 1979. 12. **Канализационная сеть, инв. № 110/С-94226**. Протяженность – 259,2 м. 13. **Оборудование трансформаторной подстанции**, инв. № 0074. 14. **Кран-балка** грузоподъемностью 5 т, инв. № 0162.

**ЗЕМЕЛЬНЫЙ УЧАСТОК**

Земельный участок площадью 5,0290 га с кадастровым номером 120400000001000221. Целевое назначение – земельный участок для обслуживания производственной базы. Право постоянного пользования. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

**УСЛОВИЯ**

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Лот № 1 и (или) Лот № 2 по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов) – Претендент на покупку, должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Лот №1 и (или) Лот № 2 в течение 10 (десяти) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

Условия оплаты приобретенного на аукционе Лот № 1 и (или) Лот № 2 согласовываются Победителем аукциона (Претендентом на покупку) и Продавцом при заключении договора купли-продажи.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) оплачивает Организатору аукциона вознаграждение в размере 10% (десять процентов) от цены продажи Лота №1 и (или) 3% (три процента) от цены продажи Лота № 2 в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

**Аукцион состоится 24.12.2014 в 11.00 по адресу: Минская обл., Дзержинский р-н, г. Фаниполь, ул. Заводская, 1, каб. 202.**

Для участия в аукционе приглашаются граждане, юр. лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы, подавшие заявление на участие в аукционе (по форме, установленной Организатором аукциона); предоставившие заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, заявление об ознакомлении с документами, продаваемым Объектом (Объектами) (по форме, установленной Организатором аукциона) и заключившие с Организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (по форме, установленной Организатором аукциона), а также прилагаются следующие документы: юр. лица – доверенность, выданную представителю юр. лица, копии учредительных документов, свидетельства о гос. регистрации и извещения о присвоении УНП; индивидуальные предприниматели – копию свидетельства о гос. регистрации и извещения о присвоении УНП; физ. лица – паспорт, представители физ. лиц – паспорт и доверенность, удостоверенную нотариально; организациям и физ.лицам (нерезидентам РБ) – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иной кредитно-финансовой организацией, с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык; представители юр. и физ. лиц (нерезиденты РБ) – легализованную в установленном порядке доверенность. При подаче документов заявитель (представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юр. лица – документ, подтверждающий полномочия. Подача документов по почте не допускается. Сведения об участниках не подлежат разглашению.

*Задаток перечисляется на р/с 3012421830016 БИК 153001942 в Расчетно-кассовом центре № 29 в г. Фаниполь филиала ОАО «Белагропромбанк» – Минское областное управление г. Фаниполь, ул. Заводская, 3а, 222750. Получатель – ОАО «Дорстройиндустрия», УНП 100211220, ОКПО 03455184.*

Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества ОАО «Дорстройиндустрия» (Лот №__), **проводимом 24 декабря 2014 года.**

Участник, желающий участвовать в аукционе в отношении нескольких лотов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из лотов.

Задаток, уплаченный участником, ставшим Победителем (Претендентом на покупку), будет засчитан в счет окончательной стоимости Объекта (Объектов). Задаток, уплаченный участниками, не ставшими Победителем аукциона, Организатор аукциона возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона (назначенной даты его проведения в случае признания аукциона несостоявшимся) или с момента регистрации Организатором аукциона отказа участника от участия в аукционе.

**Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.30, с 13.30 до 16.30 по адресу: Минская обл., Дзержинский р-н, г. Фаниполь, ул. Заводская, 1, каб. 202. Окончание приема заявлений 19.12.2014 в 17.00.**

**Заключительная регистрация участников 24.12.2014 с 10.30 до 11.00 по месту проведения аукциона.**

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом (Объектами). Контактное лицо для осмотра Объекта (Объектов): Канашов Анатолий Васильевич, 8 (029) 715-28-46.

Организатор аукциона или Продавец вправе снять лот (лоты) с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

☎ **Организатор: 8 (017) 210-00-60, 8 (033) 300-19-97 • www.dsi.by • e-mail: jurist@dsi.by**



## НА СВАІМ МЕСЦЫ

Не перастаю здзіўляцца людзям, якія лепш за іншых ведаюць, як лепш — тым самым іншым. Як лепш зрабіць, сказаць, павярнуцца. Напэўна, у кожнага з нас ёсць такія знаёмыя, з якімі і стасункі спыніць не так проста, і адбіцца ад каштоўных указанняў амаль немагчыма. У іх заўжды ёсць рэцэпты бадай на ўсе выпадкі жыцця — праўда, апрабаваныя ў лепшым выпадку на куме стрыечнага брата суседкі па дачы. Але не гэта галоўнае. Галоўнае, што парада будзе дадзена! А яшчэ яны заўжды гатовы распавесці, як і ў чым вы не маеце рацыі...

Часта зазіраючы на жаночыя і асобна «мамскія» форумы, з прыкрасцю адзначаю, што найбольшая колькасць такіх няпрошаных дарадцаў — менавіта сярод жанчын і маці. Многія чамусьці ўзводзяць свой прыватны жыццёвы досвед у абсалют і, размахваючы ім, як сцягам, вядуць віртуальныя войны за шчасце і справядлівасць, зноў жа, у сваім прыватным уяўленні. «Колькі я ведаю шматдзетных сем'яў, усе яны або баптысты, або праблемныя, таму льготы ім трэба ўразаць», — сячэ наводмаш адна «праўдарубка» ў тэме, дзе абмяркоўваюцца льготы для шматдзетных. Так і карціць з'едліва ўдакладніць у «сеткавай усёзнайкі»: а колькі, уласна кажучы, вы ведаеце шматдзетных сем'яў — 10? 20? Але ж у адной толькі сталіцы іх больш за 9 тысяч (а па краіне — звыш 60 тысяч), і якое права маеце вы, віртуальны ананім, зневажаць усіх разам?! Спыняе толькі завучанае да аўтаматызму правіла «не карміць троляў», каб не падтрымліваць спрэчку дзеля спрэчкі.

А колькі шуму ўздымаецца заўжды вакол пытання, што больш важнае для жанчыны — сям'я ці кар'ера! Даходзіць да адкрытых зняваг і абраз: амбіцыйныя кар'ерысткі абзываюць жанчын, для якіх галоўная жыццёвая задача — дом і сям'я, тыя ў адказ з пагардай «шкадуюць» іх і ўзгадваюць пра шклянку вады ў старасці, а бізнес-лэдзі, якія цудам сумяшчаюць абедзве справы, раздражняюць і першых, і другіх...

У нас з сяброўкамі нядаўна таксама зайшла размова на гэтую тэму. Нехта лічыў, што спачатку варта займацца кар'ерай, а потым ужо будаваць сям'ю, нехта даводзіў, што можна паспець усё, нехта прытрымліваўся традыцыйнай мадэлі: «Галоўнае ў жыцці — сям'я і дзеці». «А ты што? — катурхала мяне адна з дзяўчат. — У цябе дзіця ўжо ёсць, трэба рухацца ў прафесіі. Я на тваім бы месцы ўжо, напэўна, галоўным рэдактарам была!» — «Прабач, — кажу, — але гэта немагчыма. Ты ведаеш пра «маё месца» толькі тое, што я сама расказваю, і ты б, напэўна, зрабіла іншы выбар — але ў тым і справа, што выбар у кожнага свой, і ён не можа быць правільным ці няправільным, ён проста ёсць». Да адзінага меркавання мы, зразумела, так і не прыйшлі. Дый навошта? Затое дамовіліся, лічу, пра самае галоўнае: ніхто не мае права вырашаць за іншага, што для яго лепш. Асабіста я глыбока паважаю тых жанчын, якія і некалькіх дзяцей выхоўваюць, і дысертацыі пішуць, альбо медалі заваёўваюць, альбо прадпрыемствамі кіруюць. Але ніколі не ўпікну і тых, хто не хапае з неба зорак, а проста выхоўвае дзяцей, жыве іх будзённымі клопатамі і падтрымлівае сямейны агмень... Бо ў тым і ёсць наша каштоўнасць, што ўсе мы — розныя, і кожны ці кожная — на сваім месцы.

...Вы не згодны? Маеце поўнае права. Вы ж не на маім месцы :)

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**


# Сямейная газета

Выпуск № 18 (22)


■ Асабістая справа

**Алеся КАКОШНІКАВА:**

# «Для мяне ніколі не існавала выбару — кар'ера ці сям'я»

**Цяпер у яе каханы муж і любімая справа, якая, да таго ж, прыносіць грошы: яна — кіраўнік інтэрнэт-партала prazdnik.by. А пачыналася ўсё некалі з педагагічнага ўніверсітэта і жадання стаць дрэсіроўшчыцай. Зрэшты, Алесіна гісторыя — зусім не казка пра тое, як простая дзяўчынка з Мар'інай Горкі ў адзін цудоўны дзень заваявала сталіцу і стала бізнес-вумен. Проста таму, што ў гэтай гісторыі вельмі часта паўтараецца слова «працаваць», памножанае на арганізатарскі талент і неўтаймоўны імпэт зрабіць свет лепшым.**

— Я з дзяцінства была вельмі актыўнай, — узгадвае Алеся. — Пры тым я была звычайнай савецкай дзяўчынкай з нармальнай савецкай сям'і: тата — настаўнік, мама — бухгалтар, а я — вельмі актыўная, жвавая, выдатніца і ўсё астатняе. У школе была камандзірам піянерскага атрада, старшынёй савета дружыны, двойчы ездзіла ў «Зубраня», адзін раз была ў «Артэку», прычым там у 13-гадовым узросце я стала прэзідэнтам рэспублікі «Лазурная»... А яшчэ захаплялася казкамі — чытала іх, напэўна, да восьмага класа, хоць бацькі непакоіліся, што трэба пераходзіць на больш сур'ёзную літаратуру. І мне ўсё гэта падабалася, як падабалася і займацца творчасцю — у танцавальным гуртку, народным тэатры, са сваёй танцавальнай групай у мясцовым ДК, дзе мы ладзілі на ўвесь раён сапраўдныя шоу. Канешне, усе прадракалі мне паступленне ў Інстытут культуры ці ў тэатральна-мастацкі. А ў мяне былі зусім іншыя жаданні: усё дзяцінства марыла быць дрэсіроўшчыцай, пры тым, што тыграў вельмі баялася. А з 4 класа захапілася гісторыяй і замежнай мовай. Не магу сказаць, што цвёрда вырашыла стаць настаўніцай, хоць працаваць з дзецьмі мне падабалася, як і ім са мной. Але ў выпускным класе зразумела, што педагагічны інстытут дазволіць зрабіць тое, што я люблю, — далей вывучаць гісторыю і англійскую мову. І паступіла на гістарычны факультэт БДПУ імя М.Танка.

### КАБ СВЯТА БЫЛО ЗАЎЖДЫ З ТАБОЙ — СТАНЬ СВЯТАМ

Але ўжо на першым курсе, пакуль уся астатняя група працавала «на бульбе», Алеся па рэкамендацыі дэканата прыйшла ў інстытуцкую творчую суполку — народны студэнцкі тэатр «Мы». І раптам адкрыла для сябе новы свет, у які безаглядна ўлюбілася. Праўда, перш чым атрымаць ролю — не тое што галоўную, хоць эпізадычную, давялося прайсці няпростую школу стасункаў, заняткаў па акцёрскім майстэрстве, працы ў камандзе і не адну сотню разоў выконваць строгі загад рэжысёра: «Нават калі ты проста выносіш крэсла — рабі гэта бездакорна!» Затое менавіта публічныя выступленні дапамаглі Алесі пераадолець сарамлівасць з-за таго, што яна насіла акуляры. Праз некалькі гадоў дзяўчына, якая стала ў тэатры харэографам, у складзе трупы аб'ехала ўсе абласныя гарады Беларусі; выступалі таксама на фестывалях у Смаленску, Курску... «Памятаю, у «Жаніцьбе Фігаро» я выконвала танец Фартуны паміж двума актамі (напэўна, з таго часу фартуна заўжды са мной) і была «цэнтральным кустом» у фінальнай сцэне з графам Альмавівам, — смяецца Алеся. — І вырашыла, што буду расці далей». Дарасла да звання «артыст народнага тэатра» і нават пасля заканчэння ВНУ яшчэ 5 гадоў уваходзіла ў рэжысёрскую групу.



**Гэта няпраўда, што калі ты будуеш паспяховы бізнес, то нешчаслівы ў сямейным жыцці і па начах плачаш у падушку.**

Акрамя таго, менавіта тут яна сустрэла будучага мужа — «тэатральны раман» паміж яркай танцоркай і актрысай Алесяй і старэйшым на год студэнтам гістфака, гукарэжысёрам Аляксеем завяршыўся ў 2000 годзе, літаральна пасля заканчэння інстытута, стварэннем сям'і.

Але гэта пазней. А з другога курса паралельна з вучобай (між іншым, на стацыянары) і рэпетыцыямі ў тэатры дзяўчына, шырокай натуры якой усё не хапала прасторы для дзейнасці і «каралеўства было малавата», вырашыла працаваць. І не ў школе, дзе студэнты праходзілі абавязковую педагагічную працу, а ў рэкламе.

— Цяпер так весела ўсё гэта ўзгадваць — як я бясконца тэлефанавала па чарзе магчымым кліентам з бізнес-даведніка, а потым ішла на перамовы. З таго часу, дарэчы, ведаю Мінск, пэўна, лепш за некаторых гараджан, бо прайшла ўвесь яго пешкі... Першы мой заробак за месяц склаў 8 долараў — але гэта былі ўласныя грошы. Зрэшты, паступова цікавасць да гэтай працы сышла, ёй захацелася паспрабаваць сябе ў іншых сферах.

*(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)*

«ЗВЯЗДА» + АНТ

■ У вас будзе дзіця

*«Звязда» працягвае прадстаўляць чытачам маленькіх герояў рубрыкі «У вас будзе дзіця», што ўжо трэці год выходзіць на тэлеканале АНТ і шукае новыя сем'і дзецям, якія па розных прычынах засталіся без бацькоўскай апекі, любові і клопату. 53 дзіцяці за гэты час ужо знайшлі сем'і.*

Знаёмцеся з яшчэ адным чалавечкам, якому вельмі патрэбна бацькоўская цеплыня і пяшчота:

## Саша

Хлопчык, які выхоўваецца ў Кобрынскім дзіцячым доме, вельмі любіць... дзяжурыць на кухні. І з задавальненнем пералічвае свае ўлюбёныя стравы — зусім, здавалася б, простыя і звычайныя: суп, рыба, катлеты, бліны, запяканка. Ну і, натуральна, ад салодкага — торта ды цукерак, як большасць дзяцей, таксама не адмовіцца.

Наогул, па словах педагогаў, Саша — добры памочнік практычна ва ўсіх справах. Ён працавіты, вясёлы, кантактны, умее знаходзіць агульную мову з іншымі дзецьмі і дарослымі. «Мне здаецца, Сашу было б добра трапіць у сям'ю, дзе патрэбна дапамога, дзе ўсе разам працуюць і падтрымліваюць адно аднаго, — заўважае выхавальніца Ірына Рахлей. — У такіх абставінах ён зможа праявіць сябе лепш за ўсё».



*Калі вы хочаце атрымаць больш інфармацыі пра Сашу, патэлефануйце па нумары (017) 284-71-51. Гэта тэлефон Нацыянальнага цэнтра ўсынаўлення Міністэрства адукацыі. Для тых, хто жадае ўсынавіць дзіця, на сайце videopassport.ru змешчаны відэакурсы, падрыхтаваныя сумесна НЦУ і творчай групай праекта.*

■ Святло ў акне

# ПРАПУСЦІЦЬ ПРАЗ СЯБЕ

## Неабходная псіхалагічная падтрымка ўсынавіцелям і ўсыноўленым будзе аказвацца па ўсёй краіне

**У Мінску пачаў працаваць Цэнтр псіхалагічнай дапамогі ўсыноўленым і ўсынавіцелям. Адкрыўся ён падчас правядзення Міжнароднай канферэнцыі «Дзяцінства і сям'я XXI стагоддзя: праблемы і стратэгіі псіхалагічнай дапамогі і падтрымкі». Мы ўжо не раз пісалі аб праблемах адаптацыі дзяцей і бацькоў у апякунскіх сем'ях і сем'ях усынавіцеляў. Цяпер гэтай катэгорыі сем'яў будуць аказваць прафесійную дапамогу. Аб працы новага цэнтра расказаў доктар псіхалагічных навук, прафесар, кіраўнік каардынацыйнага савета цэнтра Леанід ПЕРГАМЕНШЧЫК.**




— Неабходнасць стварэння гэтага цэнтра ўзнікла ўжо даўно. Цяпер у нас ёсць магчымасць дапамагаць усынавіцелям мэтанакіравана дзякуючы супрацоўніцтву БДПУ з італьянскім некамерцыйным гуманітарным фондам PUER. Кіраўнікі фонду падтрымалі ідэю стварэння цэнтра і дапамаглі нам фінансава. Справа ў тым, што спецыялісты фонду ведаюць аб праблемах сем'яў усынавіцеляў не па чутках, бо самі сутыкнуліся з праблемамі адаптацыі дзяцей у італьянскіх сем'ях.

Наша асноўная задача — псіхалагічнае кансультаванне дзяцей-сірот, усыноўленых і ўсынавіцеляў, а таксама праца з апякунскімі сем'ямі. Яшчэ мы будзем арганізоўваць вучэбныя семінары для ўсынавіцеляў і спецыялістаў, якія забяспечваюць сацыяльна-псіхалагічную рэабілітацыю і адаптацыю дзяцей, хто па розных прычынах застаўся без апекі бацькоў.

**Звычайна, як толькі бацькі атрымліваюць дзіця, яны нібыта негалосна даюць сігнал: «Не перашкаджайце нам, вы нас праверылі, мы гатовы!»**

***— Раскажыце, у чым складанасць дапамогі такім сем'ям?***

— Справа ў тым, што сям'я ў нашай краіне ўвогуле «закрытая з'ява», а сям'я ў сітуацыі ўсынаўлення «закрытая» ўдвая. Чаму?

Працэс усынаўлення ў Беларусі пастаўлены на вельмі якасны ўзровень. У нашай краіне існуе вельмі добры Цэнтр усынаўлення. Усе людзі, якія працуюць там, адданыя гэтай справе. Яны шмат робяць для таго, каб падабраць бацькоў для дзяцей, праверыць, ці гатовы яны да будучага бацькоўства. Усынавіцелі вымушаны на гэта ісці: яны вучацца на спецыяльных падрыхтоўчых курсах, праходзяць спецыяльныя тэсты і медыцынскія агляды, прыносяць даведкі аб сямейных даходах... Але звычайна, як толькі бацькі атрымліваюць дзіця, яны нібыта негалосна даюць сігнал: «Не перашкаджайце нам, вы нас праверылі, мы гатовы!» І бацькоў можна зразумець: мала каму падабаецца, каб у яго сям'ю прыходзілі, нешта глядзелі, высвятлялі ці падглядвалі, як у замочную адтуліну.

Але на самой справе ўсе цяжкасці пачынаюцца тады, калі дзіця аказваецца дома. І гэтыя рэальныя цяжкасці ўзнікаюць і ў дзяцей, і ў бацькоў. Мы будзем дапамагаць ім у неафіцыйным фармаце.

***— Сёння ўсё часцей адбываюцца скандалы з удзелам апякунскіх, прыёмных сем'яў і сем'яў усынавіцеляў...***

— Так, але праз матэрыялы журналістаў амаль немагчыма ўбачыць рэальную карціну, якая склалася ў пэўнай сям'і. Нярэдка можна прачытаць, што вінаватыя бацькі або дзеці. Насамрэч, няма вінаватых! Людзі не змаглі знайсці кантакт, і ім патрэбна дапамога, а не абвінавачванні. Дапамога патрэбна і дзіцяці, каб справіцца з самім сабой, і маці, якой таксама трэба навучыцца кантраляваць сябе. І калі ім дапамагчы справўляцца са сваімі пачуццямі і эмоцыямі, яны змогуць заўважыць, як лепей будаваць адносіны адзін з адным.

***— Як будзе арганізавана праца ў цэнтры?***

— Мы стварылі ўсе ўмовы, каб людзі не баяліся да нас звяртацца. Па-першае, калі патрэбна дапамога ананімна, значыць, будзем гэта рабіць. Калі патрэбна анлайн-кансультацыя, будзем працаваць анлайн! Ужо рыхтуецца сайт, дзе можна будзе перапісвацца са спецыялістамі. Калі неабходна прыехаць на дом, прыедзем! Дарэчы, па правілах крызіснай дапамогі, гэта больш правільна, чым калі прыязджаюць да нас, у цэнтр. Але мы будзем аказваць дапамогу так, каб гэта было зручна і камфортна для ўсынавіцеляў. Таксама са спецыялістамі можна пракансультавацца па тэлефоне.

У цэнтры працуюць спецыялісты-псіхологі нашага ўніверсітэта. Гэта не толькі прафесары, якія чытаюць лекцыі і праводзяць семінарскія заняткі. У кожнага з выкладчыкаў ёсць вопыт работы з апякунскімі сем'ямі і сем'ямі ў стане крызісу. Упэўнены, што немагчыма расказваць студэнтам аб працы крызіснага псіхолага, калі няма практыкі. Па кніжках увогуле цяжка ўявіць усю складанасць такой дапамогі.

***— Вы будзеце працаваць толькі ў Мінску ці гэта рэспубліканскі цэнтр?***

— Мы плануем стварыць своеасаблівую базу псіхолагаў, якія будуць працаваць па розных гарадах краіны. Цяпер шукаем практыкуючых псіхолагаў, якіх мы падрыхтуем, і яны змогуць аказваць дапамогу сем'ям у сваіх гарадах. Мы будзем выконваць своеасаблівую каардынацыйную і адукацыйную дзейнасць для прафесіяналаў. Больш за тое, ужо сёння ў нас ёсць каля дваццаці валанцёраў, якія гатовы працаваць і ўдзельнічаць у дапамозе сем'ям. Гэта студэнты факультэта псіхалогіі БДПУ. Яны змогуць убачыць рэальныя праблемы ў жыцці, а не ў кніжках. Яны будуць працаваць з дзецьмі, выкарыстоўваючы розныя гульнявыя формы дапамогі. І гэта будзе ім прасцей зрабіць чым, напрыклад, мне, таму што яны ўсё ж бліжэй да дзяцей па ўзросце. Таму для нас дапамога студэнтаў вельмі важная. Ім практыка, а нам рэальная дапамога. Увогуле, цэнтр будзе працаваць на валанцёрскім руху.

***— Звычайна людзям цяжка працаваць не за зарплату...***

— Але я ўпэўнены, што матывацыя павінна быць прафесійнай, а толькі потым матэрыяльнай. Брыгада крызісных псіхолагаў пры нашым універсітэце працуе з 1990-х гадоў. Памятаеце, некалькі гадоў таму беларускі самалёт падбілі над Самалі? Тады да нас звярнулася авіякампанія з просьбай дапамагчы сем'ям беларусаў, якія страцілі блізкіх. І ведаеце, нашы псіхолагі адмовіліся ад грошай. Я ведаю, пра што гавару: такія справы робяцца не за зарплату. Безумоўна, нейкія бонусы абавязкова будуць, але для многіх прафесіяналаў дапамога ў крызіснай сітуацыі — справа гонару.

**Нярэдка можна прачытаць, што ў крызісе вінаватыя бацькі або дзеці. Насамрэч няма вінаватых! Людзі не змаглі знайсці кантакт, і ім патрэбна дапамога, а не абвінавачванні.**

***— Якія яшчэ асаблівасці ў вашага цэнтра?***

— У кожнага нашага псіхолага будзе свой псіхолаг! У нас вельмі спецыфічная праца: мы працуем з людзьмі, у якіх цяжкасці і крызіс. Вось такая ў нас, псіхолагаў, карма! Калі псіхолаг не здолее адчуць болю людзей, якія да яго звярнуліся, то яму будзе цяжка ім дапамагчы. Часта крызісныя псіхолагі нібыта «прапускаюць» чужы боль праз сябе, і застаецца асадак... Таму ў кожнага нашага спецыяліста будзе свой псіхолаг, з якім можна будзе абмеркаваць нейкія прафесійныя моманты і проста элементарна выгаварыцца.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ** ■

■ Вазьму твой боль...

# ПАДТРЫМКА НА ДОЎГУЮ ДЫСТАНЦЫЮ




**Дабрачынны рух дапамогі анкахворым дзецям «Клуб 5000» нарадзіўся пяць гадоў таму. Гэта быў няпросты перыяд у маім жыцці. Заканчваўся адзін этап, а другі ніяк не вымалёўваўся. Стомленая і зламаная, страціўшы надзею і не верачы ў заўтра, я інтуітыўна праклала «сцяжынку дабрачыннасці». І праклала яе дзякуючы падтрымцы тады яшчэ будучага мужа.**

Ён натыкнуўся на маю аб'яву ў інтэрнэце і хацеў перадаць грошы на дапамогу. Патэлефанавалў, дамовіліся сустрэцца. Я, стомленая, ехала з работы і думала пра наступную паездку ў анкацэнтр. Калега, якую пакінула на паўдарогі (мы заўсёды ехалі з работы разам), здзівілася:

— Спатканне?

— Ды якое там! — адмахнулася я. — Дзелавая сустрэча.

— Тады жадаю, каб дзелавая сустрэча перарасла ў спатканне, — хітра падміргнула яна.

Сяргей перыядычна перадаваў грошы, набываў неабходнае для пацыентаў Цэнтра дзіцячай анкалогіі, гематалогіі і імуналогіі. Падчас сустрэч мы падоўгу размаўлялі. І паступова, як і прадказала калега, дзелавое перайшло ў асабістае.

Гэта ён падбіваў мяне далучаць новых людзей да дабрачыннасці, настойваў на адкрыцці новых груп у сацыяльных сетках, дапамагаў рэгістраваць электронныя кашалькі, шукаў магчымасць эканоміць на банкаўскай камісіі, дамаўляўся з партнёрамі і вырашаў тэхнічныя пытанні.

На той час я збірала ўсяго 150 тысяч беларускіх рублёў у месяц. І іх не хапала, каб вырашыць патрэбы нават дваіх падапечных, якіх мы вялі на той час. А ён дакладваў 200 тысяч і набываў неабходнае. Так мы пачыналі «Клуб 5000».

Я баялася развіцця, баялася ўсяго новага, баялася, што не здолею. А ён верыў у мяне:

«Ідзі, рабі, я дапамагу».

Калі я цярпела няўдачы, калі мяне крыўдзілі, ставілі палкі ў колы, калі паміралі падапечныя, я рыдала ў яго на плячы. Я падтрымлівала іх, а ён — мяне. Мы ўсё прайшлі разам. І толькі дзякуючы яму з'явіўся «Клуб 5000».

Мяне заўсёды здзіўляла, як трэнер бяжыць усю дыстанцыю побач з бегуном. Падбадзёрвае яго, падштурхоўвае, абганяе, вадзічкай адпойвае, а то яшчэ і мех з запасамі на ўсялякі выпадак нясе. Ён радуецца поспехам вучня, хоць сам пераадолевае тую ж дыстанцыю. Падтрымка акрыляе спартсмена, і яна ж творыць цуды з трэнерам. Яна патрэбна абодвум.

Калі цябе падтрымліваюць, ты зробіш яшчэ больш, чым здольны. Калі ў цябе не вераць, ты не адолееш нават тое, што заўсёды давалася лёгка.

Памятаю, я, дзяўчынка з пасялковай школы, заявіла, што збіраюся паступаць у БДУ. Школьная настаўніца засцерагала:

— Не суньcя, табе туды не прабіцца.

Я цэлы дзень ліла слёзы, зачыніўшыся ў ваннай. Я чула, як аб словы настаўніцы разбілася мая мара. Але тады падтрымала маці:

— У цябе залаты медаль. Хоць ты і не займалася з рэпетытарам, але ж цэлы год самастойна штудзіравала матэрыял. Мая разумніца, усё атрымаецца.

Вось тады я, будучы журналіст, адчула сілу слова. І сілу падтрымкі. Я паступіла ў БДУ дзякуючы сваёй маці.

Я пачала супрацоўнічаць з радыё ў студэнцкія часы. І ўжо тады ездзіла валанцёрам у бараўлянскі анкацэнтр. Запісвала пацыентаў і рабіла героямі сваіх перадач. Памятаю, цётка Люда, маці Дзімкі, праслухоўваючы праграму, лёгка так схіляла галаву на бок і з гонарам вымаўляла: «Гэта наша Таня вяшчае». І ў свой першы прамы эфір я пайшла з гэтым «наша Таня вяшчае». Дзімкі тады ўжо не было. Я доўга не магла змірыцца са стратай і часта размаўляла з ім у думках. Такая размова дапамагла перажыць хваляванне перад эфірам. Я адчувала, як ён падтрымлівае мяне з нябёсаў і ганарыцца. Працаваць на радыё я стала дзякуючы Дзімку.

Ёсць у маім жыцці чалавек, які дапамог мне паверыць у сваю прывабнасць і быць прыгожай. Ёсць чалавек, які падтрымаў схільнасць да замежных моў. Ёсць чалавек, які раскрыў здольнасць добра гатаваць. Ёсць чалавек, дзякуючы якому я навучылася плаваць. Гэта я пра падтрымку. А цяпер вярнуся да мужа.

Сяргей і сёння робіць шмат спраў у «Клубе 5000». Я не сунуся туды, за што ён адказвае, і нават не разбіраюся ў гэтым. Мы збіраем па 20-30 мільёнаў беларускіх рублёў на дапамогу анкахворым дзецям штомесяц. За гэты час 45 сем'яў сталі падапечнымі «Клуба 5000» на пастаяннай аснове і яшчэ сотні атрымалі разовую дапамогу.

Вырас клуб, вырасла і сям'я: мы з Сяргеем гадуем паўтарагадовага сына. Цяпер утраіх вядзём грамадскую дзейнасць, нясём сацыяльную ношу. Але яна становіцца ўсё цяжэй, а мае мужчыны ўсё менш падтрымліваюць мяне. За пяць гадоў «Клуб 5000» і сям'я сталі сапернікамі. Яны змагаюцца за маю ўвагу і месца пад дахам. Клуб выбіваецца ў лідары. Валанцёры, паплечнікі і аднадумцы — мы ўсе вялікая сям'я. Але яна не павінна замяніць сапраўдную сям'ю. Справа, якая калісьці аб'яднала нас з мужам, цяпер аддаляе.

Апісваючы знаёмства і нашы першыя сустрэчы, я прыгадала, як Сяргей распавядаў тады пра сваю справу, сваё захапленне.

«Бацькі лічаць дрэннай ідэяй, сябры не ставяцца сур'ёзна, знаёмыя ўвогуле не разумеюць. А я хачу развівацца ў гэтым кірунку. Хачу, каб хобі перарасло ў асноўны занятак. Але мне патрэбна падтрымка».

Я тады падумала: «Што тут складанага, падбадзёрыў бы хлопца. Глядзіш — і атрымаецца нешта».

Праз пяць гадоў мой муж застаецца верным свайму захапленню. Але гэта па-ранейшаму хобі, якое ніхто не ўспрымае сур'ёзна. Здаецца, надышла мая чарга падтрымаць яго.

**Таццяна НЕМЧАНІНАВА,**
**пакуль яшчэ кіраўнік**
**дабрачыннага руху «Клуб 5000».**

# ЗАГАРТУЙСЯ І... НЕ ЧХАЙ!




**І чаму дзеці часцей за дарослых пакутуюць ад вострых рэспіраторных вірусных інфекцый? Усё проста. У дзяцей органы дыхання маюць меншыя памеры, насавыя ходы і гартань вузкія, слізістая абалонка носа пяшчотная, з вялікай колькасцю сасудаў. Усё гэта спрыяе таму, што нават пры невялічкім запаленні слізістыя рэзка набухаюць, і вось ужо малое пачынае дыхаць праз рот. Пры больш выражаным запаленні звужаецца прасвет гартані... Органы дыхання ў дзяцей знаходзяцца да таго ж у стане развіцця, а любое захворванне выклікае цяжкае паражэнне тканак і органаў, якія растуць.**

Словам, у дзяцей нізкая супраціўляльнасць інфекцыям, выправіць гэты «недахоп» цалкам магчыма. Трэба толькі не ленавацца.

Лянівых мы ў гэтым выпадку назавём незагартаванымі. У такіх дзяцей нават умеранае ахаладжэнне зніжае ўстойлівасць арганізма да вірусаў і бактэрый. Менавіта вірусы (грыпу, парагрыпу, рынавірусы, адэнавірусы, рэспіраторна-сінцытыяльны вірус, энтэравірусы) і бактэрыі (стрэптакокі, гемафільная палачка, менінгакокі, стафілакокі, энтэракокі і інш.) — прычына вострых рэспіраторных захворванняў, нагадвае **загадчыца педыятрычнага аддзялення 3-й гарадской дзіцячай клінічнай паліклінікі г. Мінска Святлана ДЗЯРУГА**.

Актыўнае размнажэнне вірусаў у эпітэліі рэспіраторнага тракта істотна пагаршае «сітуацыю» ў верхніх дыхальных шляхах. Цяпер бактэрыям значна лягчэй трапіць углыб дыхальных шляхоў, каб «утварыць» там запаленчы працэс.

## ПАРТРЭТ ВОРАГА

У розных вострых рэспіраторных захворванняў ёсць агульныя прыкметы:

насмарк, кашаль, пачырваненне зеву, ахрыплы голас, павышаная тэмпература цела, галаўны боль, ваніты, зніжэнне апетыту.

## НЕБЯСПЕКА

Любая рэспіраторная вірусная інфекцыя значна аслабляе абарончыя сілы дзіцячага арганізма. Гэта спрыяе...

...узнікненню ўскладненняў, якія выклікаюцца бактэрыямі (запаленне лёгкіх, запаленне сярэдняга вуха, прыдатачных пазух носа і г.д.);

...ажыўленню ачагоў хранічнага танзіліту, бранхіту, хранічных захворванняў страўнікава-кішачнага тракта, нырак і інш.

## УМАЦОЎВАЦЬ ЗАГАДЗЯ

Ведаеце, што адбываецца падчас пераахалоджвання? Парушаецца нармальны зварот крыві і лімфы, узмацняецца ўтварэнне слізі ў верхніх дыхальных шляхах, а застой крыві і лімфы, вялікая колькасць слізі актывізуюць мікробы, якія пастаянна знаходзяцца ў арганізме, але, што называецца, чакаюць свайго часу. Для загартаванага арганізма гэта ўсё не страшна: ён справіцца з падобнымі змяненнямі, а вось незагартаваны — захварэе.

**Дзеці дашкольнага ўзросту пакутуюць ад вострых рэспіраторных захворванняў дзесьці ад 4 да 8 разоў на год, школьнікі — ад 2 да 4.**

Калі не выпрацаваць устойлівасць да холаду, давядзецца пастаянна прастуджвацца. Пачынайце загартоўванне з першых дзён жыцця дзіцяці. Паветраныя ванны, прагулкі на свежым паветры... І не ўхутвайце дзіця празмерна. Летам дазваляйце хадзіць басанож па пяску, траве, восенню і зімой — па доме. Перыядычна рабіце вільготныя абціранні (мясцовыя і агульныя), кантрасны душ, аблівайце вечарам ступні халаднаватай вадой. Калі дзіця наведвае басейн — проста выдатна.

Прывучыце дзіця штодня паласкаць гартань. Дзецям са зменянымі міндалінамі трэба паласкаць горла раніцай і на ноч (на шклянку вады — 1 г солі і 0,5 г соды). Спачатку тэмпература вады можа быць +28 градусаў, праз 2-3 дні можна знізіць яе на 1 градус, пасля — яшчэ на 1...

### КАЛІ ПОБАЧ ХВОРЫ

**Вучыце дзіця правільна паводзіць сябе, калі яно захварэла і калі хварэюць навакольныя.**

**Падчас кашлю і чхання хворы павінен закрываць рот і нос насоўкай. У яго павінны быць асобны посуд і ручнік.**

**Калі дома нехта захварэў, астатнім, у тым ліку і дзецям, пажадана карыстацца марлевымі павязкамі.**

## НЕ САКРЭТ

• **ПРА СПОРТ.** Рэгулярныя фізкультурныя заняткі, спорт умацоўваюць мышцы, павялічваюць карысны дыхальны аб'ём лёгкіх, развіваюць нармальнае насавое дыханне, а ўсё гэта разам павышае супраціўляльнасць да вострых рэспіраторных захворванняў.

• **ПРА ЕЖУ.** Харчаванне павінна быць паўнацэнным, збалансаваным па бялках, тлушчах, вугляводах, з дастатковай колькасцю мікраэлементаў, мінеральных соляў, вітамінаў. Абавязкова ўжываць свежыя фрукты, гародніну, зяленіва, сокі.

• **ПРА ЧЫСЦІНЮ.** Праветрыванне, промні сонца, бездакорная чысціня — злыя ворагі многіх рэспіраторных вірусаў. Імкніцеся як мага часцей праветрываць памяшканне. У халодны час года — 3-4 разы на дзень па 15-20 хвілін, летам вокны трэба трымаць адчыненымі ўвесь дзень. Прыбіранне кватэры рабіце пры адчыненых вокнах, паколькі разам з часціцамі пылу ў паветра паднімаюцца вірусы і мікробы.

• **ПРА РАСЛІНЫ.** Калі ваша дзіця з тых, хто часта і падоўгу хварэе, не абыйдзецеся без фітатэрапіі. Гатуйце паводле інструкцыі гарбату з коранем салодкі, эўкаліптам, календулай, экстрактам радыёлы, элеўтэракоку, коранем жэньшэню, пропалісам, памятайце пра настой эхінацэі, лімонніка кітайскага і інш. Усе гэтыя расліны стымулююць актыўнасць клетак імуннай сістэмы.

• **ПРА ТЭАТР.** У час павышанай захваральнасці не хадзіце з дзецьмі ў госці, кіно, тэатры, магазіны. Заўважана, што больш за ўсё рэспіраторных захворванняў бывае ў перыяд школьных канікулаў, калі масавыя відовішчныя мерапрыемствы разам са школьнікамі наведваюць іх малодшыя брацікі-сястрычкі.

## МОЖНА І ПРЫШЧЭПКУ

Не забывайцеся на вакцынацыю. Яна, праўда, ёсць толькі супраць віруса грыпу (праводзіцца па паказаннях), а таксама інфекцый, выкліканых гемафільнай палачкай (уключана ў каляндар прышчэпак) і супраць пнеўмакокавай інфекцыі (паказана дзецям, якія часта хварэюць, не ўваходзіць у каляндар прышчэпак). Вакцыны спрыяюць імуннай неўспрымальнасці да ўзбуджальнікаў, стымулююць арганізм, што скарачае частату вострых рэспіраторных інфекцый.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**



### ЛЯНОТА, ЛЯНОТА...

**Запомніце самі і патлумачце свайму дзіцяці, што прыкладаць асаблівыя намаганні для ўмацавання свайго здароўя вельмі важна. Слабы, незагартаваны, лянівы арганізм пры сутыкненні з рэзкай зменай тэмпературы, інфекцыяй, фізічнай перагрузкай, стрэсавай сітуацыяй пацерпіць паражэнне, а моцны — не здасца.**

# ЯК ВЫ ЗМАГАЕЦЕСЯ З ПРАСТУДАЙ І ВРВІ?



**Анастасія ШПАКОЎСКАЯ (актрыса, салістка гурта «Нака»):**

— Я лічу, што большасць захворванняў залежыць ад эмацыянальнага стану чалавека. Калі ты пакрыўджаны, раздражнёны ці адчуваеш сябе самотным, то аслабляецца і ўнутраная абарона арганізму. І ў першую чаргу цябе адольваюць прастудныя захворванні. Таму я імкнуся захоўваць унутраную стабільнасць, хоць з маёй работай гэта не проста. Калі адчуваю, што недзе даю слабіну, то адразу пачынаюць балець горла, галава. Але нават калі прастуда падступілася, стараюся не ўжываць хімічных прэпаратаў. П'ю гарбату з зёлак, дапамагае гамеапатыя. А наогул самае галоўнае ў лячэнні — гэта стымул да выздараўлення, жаданне хутчэй паўнавартасна жыць.



**Ніна БАГДАНАВА (спявачка, тэлевядучая):**

— Перш за ўсё, каб перамагчы прастуду, спажываю часнок, раблю чай з імбірам, а таксама гарбату з зёлак. Дома ў нас ёсць інгалятар, што дазваляе рабіць інгаляцыі з мінеральнай вадой. Дапамагаюць і розныя мазі з эфірнымі алеямі. А калі яшчэ ёсць цёплыя шкарпэткі, якія мама звязала, і пра вас клапоціцца блізкія, то ніякая прастуда не страшная... Дзеткам у такіх выпадках раблю прамыванне носіка спрэямі з марской вадой і рамонкавы чай. Ад тэмпературы дапамагае стандартны дзіцячы ібуфен. Для самага маленькага толькі груднное малако з маміным імунітэтам. Лекамі карыстаюся толькі па прадпісанні ўрача! І часам мяне абураюць парады фармацэўтаў у аптэках, якія па апісанні сімптомаў пакупнікамі даюць ім нейкія рэкамендацыі — не ведаючы, якія ёсць нюансы захворвання ў гэтага чалавека альбо хранічныя захворванні.



**Юлія БЫКАВА, спявачка:**

— У мяне за доўгі час урачэбнай практыкі імунітэт умацаваўся так, што мяне мала якая зараза бярэ. А вось сын, які сёлета пайшоў у першы клас, сапраўды часта «чапляе» хваробы. І тут асабліва нічога не зробіш. Так летам мы загартоўваемся, малы бегае басанож па расе, але калі сутыкаецца з мікробамі, усё адно хварэе. Тым больш, я адказная мама, таму не магу сабе дазволіць адвесці ў школу дзіця з кашлем ці насмаркам. А многія так робяць, і гэтыя мікробы цыркулююць паміж дзецьмі. Як змагацца? Шчыра кажучы, у мяне няма цудадзейнага рэцэпту — гэта проста трэба прымаць і лячыць. Спачатку спрабуем народныя метады. Калі ж яны не дапамагаюць, пераходзім на лекі. І, натуральна, ніколі адразу не ўжываем антыбіётыкі — толькі калі сапраўды магчымы сур'ёзныя ўскладненні.



**Аляксей БУРНАСЕНКА, рэжысёр, акцёр, трэнер па майстэрстве публічных выступленняў:**

— З прастудай не змагаюся ніколі. Я ж не хвараю. Прастуда для мяне — гэта знак таго, што арганізму патрэбны адпачынак ад працы. Каб прадухіліць прастуду, я правільна і шмат ем вітамінчыкаў, асабліва «С». Таксама прысутнічае ў маім рацыёне часнок. І рэгулярна загартоўваюся (з 2000 па 2005 год купаўся ў палонцы на замерзлым возеры — на Камсамольскім), а менавіта штодня — кантрасны душ. Яшчэ рэгулярныя, 2-3 разы на тыдзень, прагулкі па снезе босымі нагамі (толькі пачынаць трэба асцярожна і павольна). Наогул, лічу, што ўсё залежыць ад таго, якія думкі ў галаве. Я зламаў у сваёй галаве тую звычку, што ўкаранілі продкі: «Выйдзеш з голай шыяй — прастудзішся», «Дыхнеш зімнага паветра — прастудзішся». А большасць людзей не выдаліла ў сваёй свядомасці гэтую «праграму», і іх арганізм дакладна ведае: калі дыхнуў, то трэба захварэць. Для падтрымкі арганізму я імкнуся апранацца не «каб было цёпла», а «каб было холадна» (калі адчуваеш крыху холад). Што датычыцца лекаў, то лічу: не варта ніколі верыць рэкламе. Варта мяняць свае думкі, не дазваляючы ўжываць слова «хвароба». Не казаць ніколі і нікому «не хварэй», а казаць «будзь здаровы». Не казаць «я хварэю», а казаць «я выздараўліваю». Калі ж прастуда ўсё ж напаткала, то можа дапамагчы ідэальны хуткасны рэцэпт: вялікі кубак гарачай гарбаты з лімонам (выцісніць туды сок лімона — чвэрць ці палову), мёдам (шмат мёду) і бальзамам (Рыжскі бальзам, Ягермайстэр ці, урэшце, беларускі бальзам альбо каньяк). Добра дапамагае інжыр. І пабольш вадкасці.

■ Сябар паляўнічага

# Голас і хуткія ногі, якіх баяцца лісы ды зайцы

**У асенне-зімовы перыяд палююць на лася, казулю, аленя. Але з даўніх часоў не менш традыцыйнай і любімай забавай застаецца паляванне з ганчакамі на зайцоў і лісу. Яно, вядома ж, мае свае асаблівасці: сабака, узяўшы след звера, з брэхам гоніць яго да паляўнічага. Ганчакоў яшчэ называюць «паратымі», што азначае «хуткаsuccessfulнія». Пра асаблівасці гэтых сабак і крытэрыі іх выбару для палявання распавяла галоўны кінолаг Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў Таццяна ЧУМАКІНА.**

## ГАНЧАКІ БЫВАЮЦЬ РОЗНЫЯ

Парод ганчакоў налічваецца даволі многа — каля 60. Самым вядомым і любімым для беларускага паляўнічага стаў рускі ганчак. Сімпатыі зававалі англа-рускі, выхадцы з прыбалтыкі — эстонскія, латвійскія, літоўскія. Сёння можна адкрыта казаць і пра адраджэнне беларускага ганчака. Як жа выбраць сваю «маланку» на зайцоў і ліс?

Кожная парода мае свае асаблівасці. Напрыклад, самы буйны з ганчакоў — англа-рускі, бацькамі якога лічацца фоксхаўнды — прызнаныя ў свеце лісагоны. Продкам «эстонца» з'яўляецца «англічанін» бігль, у чым можна ўпэўніцца, зірнуўшы на пысу жывёлы. Невялікіх і не надта хуткіх ганчакоў у Эстоніі сталі выводзіць у сярэдзіне 30-х гадоў мінулага стагоддзя: у той час у краіне дзейнічаў закон, паводле якога забаранялася паляванне з сабакамі, чый рост


Эстонскі.


Англа-рускі.

у карку перавышаў 45 сантыметраў. Справа ў тым, што папуляцыя капытных у тых месцах моцна скарачалася, а вялікія паляўнічыя сабакі часта ранілі казуль і ланяў.

У радаводзе літоўскага ганчака ёсць кроў ратвейлера і ягдтэр'ера: селекцыянеры правялі сапраўды вялікую працу над пародай. А латышы актыўна «змешвалі» пароды — і ў выніку атрымалі чорна-падпалых сабак сярэдняга росту. Ёсць вялікая група чатырохногіх гатунку, якую празвалі «ганчакі па крывяным следзе». Зараз набіраюць папулярнасць баварскі горны і чэшскі гановерскі.

Беларускі ганчак — першая нацыянальная беларуская парода, яна сёння ўдала выпрабоўваецца на кабанах. У свой час такія сабакі былі вядомыя як ганчакі з чорнымі спінамі. Пасля Вялікай Айчыннай асноўнае пагалоўе гэтай пароды было вывезена ў Польшчу. Апошнія 10 гадоў энтузіясты пачалі збіраць сабак з гэтай народнай групы. Яны пазіцыянаваліся як паляўнічыя на кабана і капытных жывёл.

Самым папулярным застаецца рускі ганчак. Тыповы прадстаўнік гэтай пароды падобны на сваім тыпе і складзе на ваўка — такі ж цяжкаваты позірк, моцны сухі целасклад, кароткая, магутная шыя, моцныя лапы-«рычагі».

## ДЫПЛОМ АБАВЯЗКОВЫ!

Калі вы хочаце выбраць ганчака спецыяльна для палявання толькі на лісу альбо толькі на зайцоў, варта праверыць радавод сабакі. Калі яго бацька ці маці паходзіць з пароды лісагонаў, альбо мае дыплом «па лісе», хутчэй за ўсё, шчаня будзе такім жа. Карацей, калі ва ўгоддзях будзе выбар паміж зайцам і лісой, такі сабака выбярэ менавіта лісу. Будзьце пільнымі, бо гэтая асаблівасць характэрна для любой пароды.

— Працоўныя якасці паляўнічай сабакі павінны быць пацверджаны палявым дыпломам, — расстаўляе кропкі над «і» Таццяна. — А яшчэ лепш, калі гэта будуць палявыя дыпломы са спаборніцтваў, дзе патрабаванні жорсткія, а канкурэнцыя вышэйшая. Адначасова можна праверыць і экстэр'ер (знешні выгляд сабакі, які выражаецца ў прапорцыях, гарманічнасці і асаблівасці формаў целаскладу, улацыях пародзе, полу, узросту і тыпу канстытуцыі жывёлы і таксама пацвярджаецца адзнакай. — **Аўт.**)

Таццяна Чумакіна не рэкамендуе браць на выхаванне дарослага сабаку:

— Хто ведае, якія звычкі ён пераняў ад папярэдняга гаспадара? А для разавага палявання ў паляўнічых гаспадарках можна замовіць паслугу — вопытнага егера і сабаку.

Як вызначыць, ці здаровае шчаня? Ужо да месяца яно павінна стаяць на чатырох лапах і ўмець добра перасоўвацца. Зубы з правільным, у форме нажніц, прыкусам — па 6 разцоў зверху і знізу, чатыры іклы — норма для сабакі, якому ўжо месяц. Шчанюкоў лепш не адрываць ад маці, пакуль ім не споўніцца паўтара месяца. Матчына малако дазваляе захаваць імунітэт ад інфекцыйных захворванняў, дае неабходныя вітаміны і мікраэлементы. А бясцэнны вопыт жыцця і стасавання са светам? Чым больш такога вопыту, тым лепш для сабакі.

Выбіраць шчаня можна ўжо нават з нованароджаных: характар сабакі можна прасачыць і ў такі ранні перыяд. Не заміне зрабіць і агульныя тэсты: распаўсюджаны з'яўляецца праверка на арыентацыю сабакі ў прасторы. Сляпое і глухое шчаня кладуць на зэдлік і глядзяць, як доўга яно зможа ўтрымацца. Альбо адносяць на два—тры метры ад маці і глядзяць, у які бок яно пабяжыць. Калі яно адразу рванецца да маці — то перад вамі здаровае шчаня. Рэакцыю будучага «паляўнічага» правяраюць наступным чынам — кідаюць ключы ці іншую рэч на падлогу.

Таццяна адзначае, што выхаваннем сабакі трэба заняцца з першай хвіліны. Мянушка, месца, забараняльныя каманды — гэта неабходныя элементы агульнай дрэсіроўкі.

## АБРОЖАК ЯК НАВІГАТАР

Што датычыцца менавіта ганчакоў, то іх прывучаць можна ў 10-12 месяцаў. Метады дрэсіроўкі ёсць розныя — можна хадзіць са шчанюком, а можна дадаць і вопытнага сабаку — малы навучыцца праз перайманне ад старэйшых. Падчас палявання важным этапам становіцца адкліканне сабакі назад. Навучыць гэтаму прыёму можна, паклікаўшы сабаку па мянушцы і пратрубіўшы ў ражок.

— Не заўжды сабаку можна адазваць, і, як паказвае практыка, часта паляўнічыя аб гэтым не клапоцяцца, — тлумачыць Таццяна Чумакіна. — Для ганчака вельмі важна такая якасць, як «вязкасць» — сабака ні ў якім разе не сыходзіць са следу звера, якога гоніць. Добра, калі гэта заяц-русак, які ходзіць па коле. А касуля можа доўгі час рухацца па прамой, і, калі ганчак напаў на яе след, вернецца ён не надта хутка.

Як правіла, сабака заўжды вяртаецца на тое месца, адкуль ён пачаў «працаваць». Можна зрабіць працэс і надзець на ганчака аброжак з GPS-навігатарам. Беларускія паляўнічыя выкарыстоўваюць іх вельмі часта, бо гэта добры сродак адшукаць свайго сабаку і перахапіць яго на месцы. Праўда, такі дзвайс абыходзіцца ў капеечку — у сярэднім аброжак каштуе прыкладна 500 долараў.


Беларускі.

Выдатны для палявання ганчак — гэта самастойны сабака, з добрым чуццём, параты і з «музычным» голасам — гэта таксама мае значэнне.

А ў заключэнне нагадаю: зіма — самы час для палявання! Добрых вам трафеяў!

**Кацярына РАДЗЮК**

■

# ГЭТА ВУШЫ — ТАГО, КАГО ТРЭБА ВУШЫ...

**Калі вы вырашылі завесці ў якасці хатняга гадаванца карлікавага дэкаратыўнага труса, то важна не выбіраць жывёлу па прынцыпе «Вой, які прыгожанькі!», а спачатку добра азнаёміцца з пародай. Тым больш, карлікавы трус хоць і мілы звярок, але валодае звычкамі дзікай жывёлы. Наогул ён падыдзе тым, хто не любіць уставаць рана (чаго патрабуе сабака), а таксама тым, хто не паддаецца агульнаму захапленню кошкамі.**

Трусы могуць лёгка пражыць пяць і больш гадоў — гэта не мышы ці хамякі. «Не набывайце труса на рынку: там і з пародай не ўгадаеце, і хворы можа дастацца, — пераконвае гаспадыня гадавальніка Наталля Калеснікава. — Праверамы ж заводчык і дакументы патрэбныя мае, і падкажа або сам зробіць неабходныя прышчэпкі. Лепш за ўсё купляць жывёлу 3-4-х тыдняў ад роду. Дзеці могуць клапаціцца пра трусоў, пачынаючы з 7—10 гадоў, не раней. У малодшых яшчэ недастаткова развітыя маторныя навыкі, і яны не адчуваюць розніцы паміж моцным і лёгкім сціскам. Дарэчы, многія пароды трусоў не вельмі любяць, калі іх бяруць на рукі, і могуць даволі сур'ёзна падрапаць вам рукі кіпцюрамі, а маленькія трусы рызыкуюць зваліцца і зламаць сабе лапы».

Трусы рэдка ладзяць з іншымі хатнімі жывёламі, таму што знаходзяцца далёка ўнізе «харчовага ланцугу», таму лепш, калі ён будзе ў доме адзіным гадаванцам.

Асноўная ежа дэкаратыўных трусоў — сена. Але, акрамя гэтага, ім неабходны спецыяльны корм. Яны не могуць жыць на салатах і моркве. А капусту, дарэчы, насуперак распаўсюджанаму меркаванню, ім нельга ў прынцыпе: ад уздуцця страўніка жывёла можа загінуць. Вельмі пажадана, каб у клетцы вісела крэйда або салявы камень.

Фізіялагічныя выдзяленні звяркоў адрозніваюцца высокай колькасцю аміяку, таму ў вашым доме будзе дрэнна пахнуць, калі своечасова не прыбіраць клетку і не клапаціцца аб добрай вентыляцыі. У клетцы труса заўсёды павінна быць свежае сена, а ў якасці подсцілу варта выкарыстоўваць пілавінне або драўняны напаўняльнік (апошні добра паглынае пах). Многіх трусоў можна навучыць хадзіць у прыбіральню ў латок, але далёка не ўсіх. Нават тыя, хто ходзяць у латок, пакідаюць некалькі сухіх гарошын то там, то тут, але іх лёгка прыбраць пыласосам або падмесці.

Трусы не любяць проста сядзець у сваіх клетках і нічога не рабіць. Ім таксама патрэбны цацкі і кантакты з чалавекам для таго, каб быць шчаслівымі. Некаторых варта на 2-3 гадзіны штодня выпускаць, а іншых можна раз у 3-4 дні «выгуляць».

Некаторыя самцы і нават самкі пазначаюць сваю тэрыторыю. Пакладанне (кастрацыя) і стэрылізацыя звычайна вырашаюць праблему, але лепш за ўсё гэта зрабіць загадзя. «Звычайна трусы сточваюць кіпцюры і зубы самастойна, аднак, калі з гэтым ёсць складанасці, пакажыце жывёлу спецыялісту, — раіць ветэрынарны ўрач Аляксандр Шыбко. — Не мыйце труса і не пераахалоджвайце: насмарк для іх надзвычай небяспечны. Што да прышчэпак, то вырашайце самі: калі ў вас выключна «хатняя» жывёла, якая не мае пабочных кантактаў, дастаткова прафілактычных аглядаў раз на год».

Трусы любяць жаваць і капаць, таму могуць прычыніць пэўную шкоду вашаму дому. Інстынкты прымушаюць іх грызці драты, плінтусы, парогі, шпалеры, а звяркі з самымі «выбітнымі» здольнасцямі ласуюцца палітэтыленавай плёнкай і пенапластам. А яшчэ майце на ўвазе: па начах трус не будзе спаць спакойна, ён перыядычна штосьці грызе, стукае лапамі, фыркае і рохкае (так, незадаволеныя трусы выдаюць падобныя гукі), так што аматарам поўнай цішыні гэтая жывёла таксама не падыдзе.

А цяпер крыху пра пароды.



**Гермелін (гарнастай, ён жа польскі).** Вельмі эфектны трусік. Іх раней вырошчвалі толькі для таго, каб атрымліваць белую скурку, як у гарнастая, паколькі іх поўсць, скура і кіпцюры не афарбаваны пігментам. Самцы валодаюць спакойным норавам, даволі гультаяватыя. Самкі бываюць нервовымі, хоць гэта вельмі індывідуальна. Гэтую пароду не рэкамендуецца заводзіць трусаводам-пачаткоўцам.



**Караткашэрсны карлікавы.** Гэтыя жывёлы адрозніваюцца вельмі маленькімі памерамі. Іх расфарбовак налічваецца каля 60, а футрачка мяккае і мае акуратны выгляд. Падчас палавога паспявання каляровы карлік праяўляе сур'ёзную агрэсію, таму можа кусацца і біць гаспадара лапай.



**Аблавухі «баран».** Адна з самых папулярных парод. Асаблівасць яе відаць з назвы — звісаюць вушкі. Аблавухія трусы прыязныя, спакойныя, мяккія і неагрэсіўныя. Яны выдатна ладзяць з чалавекам і дазваляюць трымаць сябе на руках, гладзіць і не праяўляюць варожасці. «Бараны» вельмі рэдка кусаюцца або б'юцца лапамі, іх можна спакойна падарыць дзіцяці.



**Карлікавая ангора (ангорская).** Іх падзяляюць на два віды. Першы — з тонкім футрам, якое нагадвае вату, а ў даўжыню дасягае 20 см. Нават часам не адразу можна зразумець, што гэта за жывёла. Труса трэба расчэсваць раз у 3-5 дзён, а ў перыяд лінькі — раз у 1-2 дні. У адваротным выпадку поўсць будзе звальвацца, бляціца і выглядаць жудасна. Другі від — з гладкай поўсцю меншай даўжыні (3-5 см), такі «кажушок» даглядаць трэба значна менш.



**Ільвіная галоўка (ільвінагаловы).** Гэты трусік, дзякуючы палажэнню сваіх вушэй і поўсці вакол шыі і мыскі, нагадвае льва, чым і заслужыў сваю назву. Яго практычна не трэба расчэсваць, таму што поўсць яго амаль не скачваецца і не блытаецца. Характар у «львёнка» спакойны і мірны, яго можна падарыць дзіцяці. Адзіная парада: не варта хапаць труса за вушы.



**«Рэкс».** Як і ў іншых жывёл, «рэкс» азначае «каралеўскі». Гэтыя трусы маюць сапраўды каралеўскую мантыю. Яны пакрытыя кароткай бліскучай поўсцю, якая нагадвае аксаміт або плюш. Характар у іх спакойны і ласкавы. Іх нават можна назваць флегматыкамі: яны не праяўляюць буянства і празмернай актыўнасці.

# «Для мяне ніколі не існавала выбару — кар'ера ці сям'я»

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

— Але я ніколі не думала, што гэта будзе інтэрнэт, — прызнаецца Алеся. — Бо ў камп'ютарах на той час наогул нічога не разумела. Калі мы пажаніліся, то жартавалі: я выйшла замуж за прапіску, а муж жаніўся з камп'ютарам.

Першае — зразумела, чаму, а другое — мець працу, звязаную з камп'ютарамі, было даўняй марай Аляксея. Нават адной з першых пакупак маладой сям'і стаў не тэлевізар, а менавіта камп'ютар, за які неадкладна засеў муж, як кажуць, «па самыя пяткі» — настройваў, нешта ўсталёўваў, а потым… пачаў гуляць. З-за гэтага ўжо праз тыдзень ледзь не здарыўся першы сямейны скандал. Праблему Аляксей вырашыў вельмі проста: знайшоў камп'ютарную гульню, якая захапіла маладую жонку. Праз нейкі час прапанаваў каханай прайсці камп'ютарныя курсы. А потым падкінуў яшчэ адну ідэю: паспрабаваць зрабіць глянцавы часопіс, які марыла выдаваць Алеся, у інтэрнэце, бо, у адрозненне ад папяровага выдання, гэта патрабавала значна менш выдаткаў. Тым больш, з працай па спецыяльнасці не задалося. Алеся вельмі хутка адчула розніцу паміж атмасферай летніка, дзе яна з задавальненнем некалькі гадоў працавала важатай, і школьнымі рамкамі з асаблівай іерархіяй, сістэмай і пастаяннымі канфліктамі. «Калі аднойчы на ўроках у калегі ўбачыла, як некаторыя дзеці адкрыта хамяць, «качаюць правы», рагочуць і ні ў грош не ставяць настаўніка, — зразумела, што я занадта эмацыянальны чалавек, каб спакойна на такое рэагаваць, і доўга не вытрымаю». Так у 2001 годзе на свет з'явіўся першы ў Беларусі вясельны інтэрнэт-праект nevesta.by. Праўда, дамены тады выдаваліся толькі юрыдычным асобам, таму рэсурс быў зарэгістраваны і належаў фірме, у якой Алеся працавала, і ўжо праз год стаў папулярным. А дзяўчыне захацелася рухацца далей — самой. Прычым не паўтараць ужо пройдзенае, а рабіць штосьці новае. Гэтым новым, як вырашылі на сямейным савеце, стала святочная тэматыка — больш шырокая і цікавая для самай рознай аўдыторыі. І 1 верасня 2002 года ў беларускім сектары інтэрнэту з'явіўся сайт prazdnik.by. Праўда, адразу ў бізнес ён не ператварыўся — спачатку гэта быў, хутчэй, агульнасямейны праект для душы.

**Мужчынскай увагай я і са сваімі 84 кг абдзелена не была — наадварот, мне дарылі кветкі, гаварылі кампліменты і ўсё такое.**



Праўда, з часам Алеся канчаткова ўсвядоміла, што сядзець на двух крэслах ёй некамфортна і трэба заняцца чымсьці адным. Кінула прыбытковую працу, напісала сабе бізнес-план і занялася любімай справай. «Тры гады мы з мужам толькі ўкладвалі ў праект: час, грошы, ідэі, душу — але аддачы не адчувалі. Былі моманты, калі я плакала ад стомленасці, хацела ўсё кінуць. Дзякуй Аляксею, што знаходзіў патрэбныя словы і падтрымліваў мяне».

## «У ЖЫЦЦІ НЯМА НІЧОГА НЕПАПРАЎНАГА, АКРАМЯ СМЕРЦІ»

На першыя грошы, зробленыя інтэрнэт-рэкламай, быў зняты офіс, набыта самая неабходная аргтэхніка і набраны мінімальны штат супрацоўнікаў. Ужо на другі месяц атрымалі прыбытак і пачалі набіраць абароты. Першым уласным праектам сталі вясельныя вечарынкі. У 2007 годзе адбыліся сямейныя гонкі на лімузінах, потым, па ўзоры маскоўскіх калег, пачаліся вядовішчныя парады нявест — кожны год з новай канцэпцыяй і аздабленнем, летнія «Фарбы дзяцінства» і зімовыя паходы ў «Сядзібу Дзеда Мароза ў Батанічным садзе» з морам падарункаў, інтэрактыўных пляцовак і забаў…



Але асобнае месца ў гэтым шэрагу займаюць кранальныя святы для будучых мам — «Пуз-парады». Падчас першага такога параду Алеся, якая 10 гадоў разам з мужам вельмі хацела нарадзіць дзіця, сама была цяжарнай. «Мне хацелася, каб усе ведалі і бачылі, якая жанчына па-асабліваму прыгожая і трапяткая ў гэты час, якая яна шчаслівая і вартая ўвагі з боку блізкіх».

Парад прайшоў у Сілічах у жніўні, а ў кастрычніку, калі Алеся была на сёмым месяцы цяжарнасці, у яе будучага малога спынілася сэрца…

Цяпер яна распавядае пра гэты адрэзак жыцця ўжо досыць спакойна. Але толькі сама ведае, чаго каштаваў гэты спакой.

— У жыцці няма невырашальных пытанняў і непапраўных момантаў. Адзіны — гэта смерць. У параўнанні з гэтым усе няўдачы ў асабістым жыцці, у бізнесе, дзе заўгодна — такая лухта! Я не ведаю, ці існуе большая трагедыя, чым страта ўласнага дзіцяці. Тым больш, калі ты ляжыш у бальніцы, а па суседстве знаходзяцца тыя, хто ўжо нарадзіў, і часам сварацца на малых: «Што ты плачаш?» Думаеш: Божа, я ўсё аддала б, каб толькі маё дзіця плакала… Мяне падтрымалі мае блізкія, бацькі, дзяўчаты — але вывеў са стану невыноснасці менавіта муж. Ён прыехаў у бальніцу. Па шчырасці, я вельмі баялася гэтай сустрэчы, бо не разумела, як сябе паводзіць, як мы будзем жыць далей… Я ўбачыла, што Аляксея мучае такі самы боль, як і мяне. Але ён узяў мяне за руку і сказаў, што не пакіне тут ні на адзін дзень, забярэ дадому, дзе мяне чакаюць сабака, кошкі, новае кіно і паход у басейн… Ён распавёў пра звычайнае жыццё, якое нас чакае, — і я паверыла. Напэўна, дзякуючы менавіта яго няспыннаму клопату я змагла аднавіцца дома пасля аперацыі, адплакацца, перажыць тое, што адбылося, і літаральна за руку з ім выйсці з гэтага ўсяго. Ужо праз тры тыдні я была на працы і з галавой акунулася ў яе.

Алеся і Аляксей вераць, што ў іх будуць яшчэ і дзеці, і ўнукі, дзеля якіх неабходна як мага даўжэй заставацца маладымі і энергічнымі, каб быць не лядашчымі, а вельмі нават сімпатычнымі бабуляй і дзядулем.

## «ПАСПРАБУЙЦЕ ЎЯВІЦЬ, ЯК ВЫ РАЗАМ СТАРЭЕЦЕ»

— Выбар кшталту «кар'ера або сям'я» перада мной ніколі не стаяў. Бо я перакананa, што трэба жыць у любові, прыгажосці і гармоніі. Гэта няпраўда, што калі ты будуеш паспяховы бізнес, то нешчаслівы ў сямейным жыцці і па начах плачаш у падушку. Ніхто насамрэч не ведае, што ў мяне ў сям'і, акрамя мяне і мужа, — а мы адмыслова не выносім свае асабістыя стасункі на публіку.

**«Тры гады мы з мужам толькі ўкладвалі ў праект: час, грошы, ідэі, душу — але аддачы не адчувалі. Былі моманты, калі я плакала ад стомленасці, хацела ўсё кінуць. Дзякуй Аляксею, што знаходзіў патрэбныя словы і падтрымліваў мяне».**

**— Няўжо муж нават ніводнага разу не раўнаваў? Усё ж на публічных мерапрыемствах бываюць розныя госці — прыгожыя, багатыя, знакамітыя, — не ўтрымліваюся я.**

— Муж? Цьфу-цьфу-цьфу, — выразна стукае Алеся па стальніцы. — Я часта ўзгадваю, як адна маленькая дзяўчынка сказала: «Каб выйсці замуж, трэба быць нафарбаванай і вясёлай». — «Чаму?» — спыталі ў яе. — «Бо ненафарбаваныя і невясёлыя ўжо замужам»… Вуснамі немаўляці, так бы мовіць… Мяне літаральна нядаўна знаёмыя павіншавалі з тым, што я пахудзела (год таму Алеся з дапамогай дыетолага пазбавілася ад 22 кілаграмаў! — **Аўт.**) і «нарэшце выйшла замуж»… *(Смяецца).* Хоць я ніколі не здымала заручальны пярсцёнак.

**— Дарэчы, наконт фенаменальнага пахудзення. Я так зразумела, што муж кахае вас усякай: і вясёлай, і ненафарбаванай, і студэнткай, і «Місіс Дабрачыннасць», незалежна ад камплексцы. Ён не спытаў: Алеся, маўляў, навошта табе гэта трэба?**

— Не. Я выходзіла замуж худзенькай, 56 кіло. Ды набрала за 16 гадоў столькі лішняга — прычым неяк незаўважна… Але — напэўна, гэта і ёсць каханне — за ўсе гады сумеснага жыцця муж ніколі ні словам, ні позіркам, ні намёкам не даў адчуць ці зразумець, што я нежаданая, нелюбімая ці яшчэ нейкая «не такая». А я, у сваю чаргу, наогул не збіралася худзець — звярнулася па парады наконт здаровага харчавання, каб аздаравіць арганізм. Бо мужчынскай увагай я і са сваімі 84 кг абдзелена не была — наадварот, мне дарылі кветкі, гаварылі кампліменты і ўсё такое. Таму проста хацелася прывесці сябе ў парадак. Цяпер вынікам задаволена — дзякуючы таму, што з дзяцінства танцавала, у мяне няма ніякіх расцяжак і пахудзець удалося без усякіх аперацый, якія б ў чуткі ні хадзілі вакол гэтага. Нельга сказаць, што муж пачаў мяне кахаць пасля гэтага больш або менш — ён проста мяне кахае, а я — яго, бо мы ўжо «прараслі» адно ў аднаго. Хоць ён, па шчырасці, не любіць часта пра гэта гаварыць, у агульнапрынятым уяўленні Аляксей не рамантык. Не, ён дорыць кветкі, але тады, калі сам гэтага хоча. Затое, напрыклад, калі я працую на кухні за камп'ютарам, можа прыйсці і надзець мне шкарпэткі, каб ногі не замерзлі…

**— У кожнага, напэўна, свая формула сямейнага шчасця. У кагосьці — традыцыйная ўстаноўка «дом-сын-дрэва», у кагосьці рамантычная задумка «жыць доўга і памерці ў адзін дзень». Якая гэта формула ў вас?**

— Калі мы толькі пачалі сустракацца ва ўніверсітэце, у мяне ўжо быў вопыт розных стасункаў — і спакойных, і палкіх, і бурлівых… Напэўна, вазьму на сябе смеласць кожнай дзяўчыне параіць наступнае: сустракайцеся з хлопчыкамі, каб умець будаваць стасункі, каб бачыць, што людзі бываюць зусім розныя. Я не кажу пра секс — я менавіта пра школу стасункаў. І вось калі вы адчуеце побач з пэўным мужчынам, што гатовы разам з ім старэць, — гэта ваш чалавек. У нас з Аляксеем было менавіта так. У нейкі момант выразна ўбачыла, як мы, ужо бабуля і дзядуля, сядзім ля каміна, я штосьці вяжу (хоць рабіць гэтага не ўмею), а ён чытае ўслых… І я зразумела, наколькі ўдзячная лёсу, што побач са мной гэты чалавек. Прызнацца, я нават склала спіс фільмаў, якія ніколі не бачыла, каб паглядзець іх з Аляксеем у старасці. І думка аб тым, што мы будзем гэта рабіць разам, мяне грэе.



**«Тэатральны раман» паміж яркай танцоркай і актрысай Алесяй і старэйшым на год студэнтам гістфака, гукаржысёрам Аляксеем завяршыўся ў 2000 годзе, літаральна пасля заканчэння інстытута, стварэннем сям'і.**

Гутарыла Вікторыя ЦЕЛЯШУК.
**Фота з асабістага архіва Алесі КАКОШНІКАВАЙ.**

Наталля ГАЙДА:

# «УСЯ СПРАВА — ВА ЎЗАЕМАРАЗУМЕННІ...»

**У яе творчым багажы — больш за 40 вядучых партый у класічных аперэтах, музычных камедыях і мюзіклах, сярод якіх Віялета ў «Фіялцы Манмартра», Марыца ў «Марыцы», Сільва, Ангільда ў «Сільве», Цэцылія ў «Каралеве чардаша», Тэадора ў «Прынцэсе цырка» — усё гэта спектаклі Імрэ Кальмана; Ганна Главары ў «Вясёлай удаве» Ферэнца Легара, Разалінда ў «Лятучай мышы» Іагана Штрауса, Стэла ў «Вольным ветры» Ісака Дунаеўскага, Чаніта, Анжэла ў «Пацалунку Чаніты» Юрыя Мілюціна, Эпіфанія ў «Мільянерцы» Яўгена Глебава; графіня Мальбара ў «Шклянцы вады» Уладзіміра Кандрусевіча...**

**Яна ўдастоена высокага звання народнай артысткі Беларусі, узнагароджана ордэнам Пашаны, медалём і ордэнам Францыска Скарыны, з'яўляецца лаўрэатам прэміі імя Ларысы Александроўскай, уладальніцай вышэйшай узнагароды Саюза тэатральных дзеячаў — «Хрустальнай Паўлінкі». Ёй было прысвоена ганаровае званне «Жанчына-легенда» ў рэспубліканскім конкурсе «Жанчына года — 2011». Вось ужо больш за 20 гадоў яна перадае свой багаты вопыт студэнтам Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў.**

**Пра свой творчы лёс, сям'ю і жаночае шчасце расказвае вядучы майстар Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра, народная артыстка Беларусі Наталля ГАЙДА.**



Наталля Гайда па-ранейшаму спявае на сцэне, яе імя ва ўсіх на слыху.

## «Куды ў артысткі з такім кірпатым носам?»

Яна нарадзілася ў Свярдлоўску, і самыя першыя гады жыцця прыпалі на цяжкі ваенны час.

*— Я памятаю сябе з трох гадоў... Калісьці я сказала пра гэта маме, і яна здзівілася: «Не можа быць!» Тады я ёй апісала, які ў нас быў пакой, якая коўдра ляжала ў мяне на канапе і як я пела і танцавала «Яблычак»... У Свярдлоўску я жыла да чатырох гадоў. Вайна, тата на фронце... Мама вучылася ва Уральскай кансерваторыі, але вымушана была кінуць вучобу і пайсці працаваць у філармонію. І толькі ў 1944 годзе яна змагла адправіць мяне ў Семіпалацінск, да татавых бацькоў. Ведаеце, тады не так проста было сесці ў цягнік. У мяне захаваліся цудоўныя ўспаміны аб тым часе, хоць і цяжкім, пасляваенным... У нас у школе быў цудоўны чатырохгалосы хор, і я ў тым хоры салiравала.*

**Так, аперэта — жанр лёгкі, яскравы, але калі ў ёй ёсць моманты драматызму, ёсць сур'ёзныя жыццёвыя калізіі, такое заўсёды хочацца іграць.**

У Сяміпалацінску, дзе прайшло яе дзяцінства, тэатраў не было, затое быў Дом настаўніка — мясцовы ачаг культуры. Там збіралася шмат цікавых людзей — у асноўным гэта былі асуджаныя па 58-м, «палітычным», артыкуле — літаратары, навукоўцы, артысты, сасланыя ў Казахстан. Там часта наладжваліся вечарыны, канцэрты, у якіх маці Наталлі прымала самы актыўны ўдзел. А вось у Іркуцк, куды сям'я пераехала ў 1954 годзе разам з бацькам-геолагам, былі 2 кінатэатры, і ў адным з іх маці пачала спяваць перад пачаткам сеансаў. Тады гэта было модна і лічылася паўнацэнным мастацтвам.

*— У тым кінатэатры, дзе спявала мама, было вялікае фае з эстрадай, і публіка спецыяльна прыходзіла на 45 хвілін раней за сеанс — на канцэрт. Загадзя вывешвалася афіша з праграмай: што грае аркестр, што спявае артыстка... Мама ўзгадвала, як ёй рукі цалавалі пасля выступленняў — так яна цудоўна спявала! Шкада, што ў яе не склаўся артыстычны лёс...*

Наташа з трох гадоў ведала ўвесь матулін рэпертуар, але стаць прафесійнай спявачкай вырашыла толькі ў дзясятым класе. Бацька смяяўся: «Куды ў артысткі з такім кірпатым носам?» А маці суцяшала: «Грымёры любы нос выпраўляць». Наталля двойчы ездзіла ў Маскву, спрабавала паступіць і ў тэатральнае вучылішча, і ў кансерваторыю...

## «Гатаваць не ўмею і не буду!»

*— Першы раз паехала паступаць у вучылішча імя Гнесіных, калі мне было 17. Аказалася, што прымаюць з 18. Такая тады, на жаль, была практыка. Я плакала: тыдзень ехала, а мяне адправілі назад! На наступны год зноў паехала і ўжо, як рабілі многія, паступала ў некалькі тэатральных ВНУ адначасова. Але ніхто не падказаў мне, што для паступлення я выбрала не той рэпертуар. Гэта значыць, на праслухоўванні я не здолела паказаць сябе як след. Ціхая, сціплая была дзяўчынка...*

Чамусьці тады ёй здавалася, што вучыцца «на артыстку» можна толькі ў Маскве. А тут — зноў не паступіла!..

*— Я вырашыла: калі не прынялі, значыць, недастаткова таленавітая — пайду вучыцца на юрыста і буду пець у самадзейнасці! Прыехала дадому, села, адгарнула даведнік і пачала шукаць адпаведную ВНУ. А ў мяне ў Іркуцку сяброўка паступіла менавіта ў юрыдычны інстытут і клікала: «Пойдзем!..» А я: «Не!» Знайшла ў даведніку — Свярдлоўскі юрыдычны інстытут, Уральская кансерваторыя... І я вырашыла: вось мая Радзіма, тут мне пашанцуе!*

Так, выбіраючы юрыдычны інстытут, Наталля падсвядома ўлічвала тое, што ў Свярдлоўску ёсць і кансерваторыя. І, калі перайшла на трэці курс у юрыдычным, усё ж такі ажыццявіла запаветную мару — паступіла ва Уральскую дзяржаўную кансерваторыю імя Мусаргскага. І гэта быў яе лёс. Бо менавіта там яна сустрэла свайго будучага мужа — Юрыя Бастрыкава.

*— Мы паступілі разам з ім у адзін і той жа год, але на першым курсе амаль не сустракаліся. Толькі на сесіях і падчас акадэмічных канцэртаў. А ўжо на другім курсе, калі я спявала на вясенним экзамене, ён падышоў, пахваліў, павіншаваў. Хаця і раней падыходзіў, здароўкаўся, вельмі дабрадушна са мной размаўляў, але я не надавала гэтаму ніякага значэння.*

А на наступны дзень, калі я прыйшла паслухаць іншых выканаўцаў, ён мне ўжо па-сяброўску сказаў: *«Наташа, ідзі сюды, я тут месца заняў!» І з таго часу пачаў да мяне заляцацца. Прызнаўся, што з самага пачатку звярнуў на мяне ўвагу. Я не паверыла: «Перастань, вы ўсе так гаворыце!» А ён: «Хочаш, скажу, у чым ты прыходзіла апранутая на кожны тур? Ты была ў чорнай сукенцы, чорных туфліках, сама чорная, загарэлая, адныя толькі белыя зубы бліщчэлі!..» І мы пачалі з ім сустракацца...*

*І вось на чацвёртым курсе спачатку мяне ўзялі ў оперны тэатр, а потым яго. Мы пажаніліся, і нас пасялілі ў гасцініцы «Вялікі Урал», насупраць опернага. Гэта быў самы найлепшы год майго жыцця: гасцініцу нам аплачваў тэатр, за намі прыбіралі, мы абедалі ў рэстаране, кавярні... (Смяецца). Гэта было цудоўна! А праз год мы атрымалі кватэру. І пачаліся побытавыя і іншыя сямейныя праблемы...*

На самым пачатку сумеснага жыцця Наталля сумленна прызналася маладому мужу: «Гатаваць ежу я не ўмею і не буду, затое буду табе добрым сябрам!» Муж пагадзіўся і ніколі не абцяжарваў яе кулінарнымі абавязкамі, нават тады, калі сам стаў народным артыстам Беларусі і вядучым спеваком опернага тэатра.

*— Юра, як і многія мужчыны, умеў цудоўна гатаваць. А калі мы ў Мінск пераехалі, тут у любой кулінарыі — усё, што хочаш: і адбіўныя катлеты ляжаць, і эскалопы, і зяляніна!.. Прыгатаваць усё гэта яму было зусім не цяжка. Я ж усё, што заўгодна, магу рабіць: навесці парадак у кватэры, мыць, прасаваць... Але гатаваць — мне шкада часу. Думаю: «Стаіш, рэжаш, рэжаш, а праз 5 хвілін — ужо ўсё з'елі!» Жыць не хочацца, калі на кухню заходжу! І наколькі не люблю гатаваць, настолькі люблю смачна паесці! (Смяецца).*

## «Спявае «Жаўрук»

Яны пражылі ў каханні і згодзе ўсё іх сумеснае жыццё. І гэта, нягледзячы на тое, што абое былі вядучыя артысты двух розных тэатраў, у іх былі розныя графікі рэпетыцый, спектакляў і гастроляў.

*— Уся справа — ва ўзаемаразуменні. Канешне, я адна не здолела б захаваць сям'ю — гэта было наша агульнае з мужам жаданне. Адыграла ролю і рацыянальнае размеркаванне сямейных абавязкаў: кожны рабіў тое, што мог. Ёсць мужчыны, якія нізашто ў жыцці не будуць гатаваць: такі муж прыйдзе, сядзе і будзе чакаць, пакуль жонка накрые стол. З такім мужам я сям'ю не захавала б. І яшчэ ведала: усё, што будзе замінаць маёй прафесіі — убок!*

*У мяне было ўсё, што трэба для сям'і, і я ўсё, што магла, рабіла для яе. І перш за ўсё — я мужа разумела. Ведаю, што ў яго спектакль, скажу: «Юра, не трэба мне нічога — рыхтуйся!» Цішыню забяспечу, спакой. Дзіця таксама прывучылі: «Ціха! У таты — спектакль!.. У мамы — спектакль!» Дачка ўсё разумела, хоць і была адзіным дзіцем у сям'і. Але мы з мужам як не распусцілі.*



З мужам і дачкой.

Дарэчы, у Мінск іх сям'я перабралася, дзякуючы мужу. У 1969 годзе Юрый Бастрыкаў выйграў конкурс, які аб'явіў Вялікі дзяржаўны акадэмічны тэатр оперы і балета БССР. Наталлю Віктараўну ўзялі ў тэатр, як яна сама жартуе, у якасці бясплатнага дадатку: у яе голасе — лёгкім сапрана — беларускі оперны асаблівай патрэбы не меў. Таму, калі ёй прапанавалі перайсці ў тэатр аперэты, які тады толькі-толькі стваралася, яна без жалю пакінула оперную сцэну. Бо аперэту вельмі любіла: ёй заўсёды было мала толькі спяваць на сцэне — хацелася і гаварыць, і танцаваць... Ёй даручылі выкананне галоўнай ролі — прыгожай, гордай, смелай разведчыцы Ірыны — у аперэце Юрыя Семянякі «Спявае «Жаўрук». Гэтым спектаклем у 1971 годзе адкрыўся Дзяржаўны тэатр музычнай камедыі БССР.

*— Так, тады для мяне ўсё так удала супала. Для кар'еры вельмі важна, як пачнеш: у якім спектаклі сыграеш, як сябе ў першай ролі пакажаш. «Спявае «Жаўрук»— тэма, канешне, вельмі хвалюючая для Беларусі: вайна, партызанскі рух, спявачка нямецкага вар'етэ — адважная савецкая разведчыца. Цудоўная роля Ірыны, выдатная музыка Юрыя Уладзіміравіча Семянякі. Гэта — проста акцёрскае шчасце!..*

## «Каханне заўсёды ўзвышае»

Сёння ў творчым багажы народнай артысткі Беларусі Наталлі Гайды — дзясяткі роляў. Нярэдка ў яе цікавяцца, якая з іх улюбёная... А Наталля Віктараўна не можа адказаць адназначна.

*— Ёсць ролі, якія можна іграць доўга-доўга і кожны раз знаходзіць у іх штосьці новае... А ёсць ролі, якія адыграла год-два — і ўжо ўсё сказала і не ведаеш, што для цябе і для гледачоў яшчэ можа быць цікавым. Пра класіку я не кажу: тут сама музыка дыктуе, можна знайсці столькі музычных нюансаў і кожны раз спяваць па-новаму. Ды і прыгожае каханне заўсёды ўзвышае. А ў савецкіх спектаклях у маіх гераінь кожны раз быў новы, яскравы характар. І спектаклі стваралі цудоўныя майстры: кампазітары Дунаеўскі, Салаўёў-Сядой, Аляксандраў, Мілюцін пісалі цудоўныя мелодыі, драматургі Гальперын, Рацэр і Канстанцінаў — цудоўныя п'есы з захапляльным сюжэтам, чаго сёння, на жаль, няма.*

*Я вельмі любіла ролю Пенелопы з аднайменнага спектакля Журбіна. Галоўная тэма ў гэтым спектаклі — жаночае самаахвяраванне. Мая гераіня выклікала ў зале такое разуменне і спачуванне, што людзі апладзіравалі стоячы. Пенелопа — жанчына, якая 20 гадоў чакала мужа. І ў разлуцы яна пакахала Клеона. Яе ж аддалі замуж зусім маладзенькай, яна і кахання сапраўднага не зведала. І вось, калі Адысей вяртаецца стары, змучаны і нікому не патрэбны і ўсе ад яго адвярнуліся, яна гаворыць: «Пойдзем, Адысей, дадому». Пенелопа ахвяравала сваім каханнем да Клеона дзеля хворага мужа. Мне вельмі спадабаўся гэты спектакль. Так, аперэта — жанр лёгкі, яскравы, але калі ў ёй ёсць моманты драматызму, ёсць сур'ёзныя жыццёвыя калізіі, такое заўсёды хочацца іграць. Канешне, такія спектаклі вельмі каштоўныя. Шчасце, што яны былі ў мяне...*

Наталля Гайда па-ранейшаму спявае на сцэне Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра, яе імя па-ранейшаму ва ўсіх на слыху. Нядаўна ў Беларускім дзяржаўным акадэмічным музычным тэатры ў трэці раз прайшоў творчы праект «Наталля Гайда запрашае...», які сабраў рэкордную колькасць ганаровых гасцей і ўдзельнікаў з розных гарадоў і краін.

А падчас правядзення III Нацыянальнай тэатральнай прэміі народная артыстка Наталля Гайда атрымала ўзнагароду «За ўклад у развіццё тэатральнага мастацтва». Гэта было так прыгожа зроблена: на заключнай цырымоніі на сцэну Купалаўскага тэатра выехаў аўтамабіль «Шэўрале дэ Люкс» 1937 года, які калісьці належаў Янку Купалу, з аўтамабіля выйшла Наталля Віктараўна, і намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Анатоль Тозік уручыў ёй ганаровую ўзнагароду...

На жаль, яе радасці ад гэтых падзей не можа падзяліць улюбёны муж. Тры гады таму народны артыст Беларусі Юрый Бастрыкаў пайшоў з жыцця. Але побач з Наталляй Віктараўнай — дачка Настасся, культуролаг, і яе сям'я. Унучка Арына — майстар спорту па тэхэквандо, сярэбраны прызёр чэмпіянату свету, ужо замужам і жыве ў Германіі, але не забывае Беларусь, стараецца прыязджаць дадому часцей. Унуку Данечку — 7 гадоў.

Тамара БУНТА



З мужам, Юрыем Георгіевічам, яго маці, Нінай Дзмітрыеўнай, дачкой Настассяй і ўнучкай Арынай.

■ Гісторыі з каморы

# НОВЫ ГОД «ЯК РАНЕЙ»:

## карона з ваты, цукеркі на ёлцы і іншыя спосабы зрабіць свята з нічога

**Для сучасных дзяцей і бацькоў падрыхтоўка да Новага года — гэта, бадай, выключна пытанне супадзення жаданняў і бюджэту. Бо, калі грошай хапае, набыць можна абсалютна ўсё: і разнастайныя карнавальныя касцюмы — хоць са штучнага футра, хоць з аксаміту і парчы, і святочна афармленыя падарункавыя наборы, і тысячу ды адно ўпрыгажэнне на ёлку, і банкет з экзатычных страў, і Дзеда Мароза са Снягуркай — хоць на дом, хоць у садок ці школу. Усё ўжо гатовае, не трэба ламаць галаву і марнаваць час. Але... чагосьці не хапае. Як у той показцы пра паветраныя шарыкі — не радуюць! Можа, таму, што цяпер няма патрэбы напружваць уласную фантазію, а значыць, менш адчуваецца той самы чароўны дух Каляд і Новага года?**



— Беласнежкі, Спайдэрмены, Вінкс, — гартаю я віртуальны каталог карнавальных касцюмаў. — У Савецкім Саюзе ўсё было прасцей: кароны з кардону і ваты, дзяўчынкі — Сняжынкі ў марлевых сукенках, хлопчыкі — Зайчыкі ў абручах з вушкамі...

— Хто табе сказаў такую лухту? — з абурэннем адгукнуўся тата. — Можа, на ранішніках у садках і былі толькі Сняжынкі і Зайцы-Мядзведзі. А ў школе ў нас ведаеш, якія конкурсы на лепшы касцюм былі! Я, памятаю, аднойчы быў мушкецёрам: «батфорты» выразаў з кардону, шпагу вытачыў са звычайнай палкі, пафарбаванай у сярэбраны колер, гарду зрабіў з накрыўкі ад бляшанкі. Капялюш узяў дзядзькаў стары, саламяны — ён вельмі пасаваў да вобразу, — упрыгожыў пафарбаваным гусіным пяром, а на мушкецёрскую накідку, здаецца, мама аддала свой шаль, толькі махры зрэзала. Ух, які знатны кавалер атрымаўся!



Натхнёўшыся гэтым апавядам, «СГ» распытала людзей розных узростаў, чыё дзяцінства прайшло ў Савецкім Саюзе, як і з чаго нават у часы татальнага дэфіцыту выраблялі маскарадныя ўборы, навагоднія ўпрыгажэнні і падарункі.

«На адзін з маіх першых ранішнікаў, які здарыўся напрыканцы 1970-х, мы з мамай рабілі карону, — прыгадвае бухгалтар Аксана Васілеўская. — Спосаб вядомы: на кардонную аснову наклейваўся не надта тоўсты слой ваты, а на яго, зноў жа на клей, выкладвалі ўзоры з бітых шкляных (а тады іншых і не было) ёлачных цацак, «дожджыку», фольгі. Нейкую адмысловую сукенку не рабілі, проста да белых калготаў і маечкі дадавалася самаробная спадніца з марлі ў некалькі слаёў: верхні мама пакінула белым і расшыла «дожджыкам», а ніжнія пафарбавала сінькай у блакітны, сіні і цёмна-сіні колер. Мне здавалася, што я была самай прыгожай Сняжынкай у карагодзе!».

«У вырабе майго навагодняга касцюма была задзейнічана ўся сям'я, — смяецца сістэмны адміністратар Ігар Пархоменка. — Бо я, як большасць хлопчыкаў, жадаў быць Касманаўтам! Цётка прывезла аднекуль з Германіі яркачырвоны камбінезон, да якога мама сшыла і склеіла з падручных матэрыялаў шлем з надпісам «СССР». Але самая складаная праца выпала тату: ён, інжынер, намаляваў чарцёж ракеты, і потым мы разам выразалі і клеілі яе з кардону, каляровай паперы — атрымалася памерам амаль з мяне! У школу неслі асцярожна, каб не змяць «хвост». Але яно таго каштавала: я быў самым прыкметным персанажам».

«Памятаю, у школе сярод старэйшых хлопчыкаў былі вельмі папулярныя Гусары: якраз выйшаў на экраны фільм «Гусарская балада», — узгадвае пенсіянерка Надзея Захарава. — Рабілі з кардону ківеры, а ў каго мамы добра шылі — курткі з футрам, са шнурамі і бліскучымі гузікамі. А ў мяне адзін з самых памятных навагодніх вобразаў — Індыянка. Мама зрабіла яго літаральна з нічога: абкруціла па манер сары вакол мяне адрэз нейкай прыгожай тканіны (можа, нават парчы — карычневай з золатам), на плячы замацавала вялікай брошкай, намалявала на лбе памадай чырвоную кропку, а на рукі надзела мноства сваіх бранзалетаў, чэшскія вітыя каралі...»

«Мы рабілі з мамай касцюм Шахматнай Каралевы, — расказвае спецыяліст па лагістыцы Вольга Гласава. — Узялі старую прасціну, размалявалі яе ў чорна-белыя квадраты, з часткі сшылі спадніцу «сонца-клёш», з другой — сабраную на плячах накідку. І, канешне, карону — чорную! Я ў дадатак вывучыла верш пра шахматы. На конкурсе касцюмаў, які праходзіў падчас балю, заняла другое месца — і вельмі засмуцілася, што не першае».

«Я быў Катом у ботах! — жыва ўспамінае прыватны прадпрымальнік Сяргей Маслоўскі. — Боты — чырвоныя, сапраўдныя скураныя, на маленькіх абцасах — ахвяравала мама. Плашч-накідку па выкрайцы ў часопісе шыла бабуля з кавалка парашутнага шоўку. А капелюша ні ў каго з родных не знайшлося — давялося выразаць з кардону і абклейваць чорнай тканінай тату. Ён жа і прымацаваў бліскучую спражку, а мама «ленінградскай» тушшу намалявала мне чорныя вусы, бровы і нос».

Як запэўніваюць практычна ўсе былыя савецкія дзеці, падрыхтоўка да Новага года ператваралася ў суцэльны рытуал, які аб'ядноўваў усю сям'ю. Адны прыдумлялі святочныя касцюмы, другія выразалі (а некаторыя нават вязалі з тонкіх швейных нітак!) сняжынкі на вокны і ёлку, трэція майстравалі гірлянды — з папяровых ліхтарыкаў, сцяжкоў, колцаў... Ішлі на розныя хітрыкі: каб упрыгожыць пакой, абмотвалі кавалачкі ваты «дожджыкам», а потым, пажаваўшы тую вату, шпурлялі з усёй сілы ў столь — і праз паўгадзіны са столі звісаў бліскучы шапаткі «дожджык».




«А мы з бабуляй выразалі гірлянды з цукерачных абгортак і навагодніх паштовак, — прызнаецца касметолаг Ала Верабей. — Яна працавала ў бібліятэцы, і напярэдадні свята ім прыходзіла вельмі шмат віншаванняў, як афіцыйных, ад розных арганізацый, так і з падзякамі ад звычайных чытачоў. А якія прыгожыя куфэркі яна рабіла з тых жа паштовак. Кожная сама па сабе магла быць падарункам, але яна абавязкова ўкладвала ўнутр які-небудзь самаробны сувенір ці цукеркі і дарыла сваякам. Бабулі ўжо даўно няма, а частка яе калекцыі паштовак захавалася, і я часам люблю перагледзець гэтыя, пажаўцелыя, але ўсё адно вельмі кранальныя, віншавальныя допісы».

Папулярную цяпер піратэхніку з поспехам замянялі серпантыны, хлапушкі і бенгальскія свечкі, якія вельмі любілі як дарослыя, так і дзеці. На ёлкі ж, акрамя разнастайных шарыкаў, шышак і самых мудрагелістых шкляных цацак, па традыцыі, вешалі таксама хто дэфіцытныя мандарыны (стараліся знайсці абхазскія — кажуць, яны былі больш сакавітымі і з прыемнай кіслінкай), хто разнастайныя цукеркі.

«Я заўжды знаходзіла, дзе мама схавала цукеркі, — прыгадвае спявачка Алена Ланская. — Аднойчы ёлка наогул засталася без іх, а «пад раздачу» выпадкова трапіў тата, які так і не прызнаўся, што гэта знайшла я... Наогул, калі гаварыць пра Новы год, адразу ўзгадваю, як у апошніх чыслах снежня мы з татам ездзілі ў лес секчы ёлку, а калі ўвялі закон, то спачатку выпісвалі і аплачвалі яе ў лясгасе, а потым ужо секлі. А ў само свята мама запякала пахкую курыцу з часнаком, мы пяклі навагодні пірог, а потым, паколькі жылі ў «хрушчоўцы», усе суседзі да раніцы хадзілі адзін да аднаго ў госці...»

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК**

■

## Дарэчы

**Зварот да народа «з тэлевізара» за некалькі хвілін да Новага года зрабіў традыцыяй Леанід Брэжнеў у 1976 годзе. Праўда, яшчэ ў 1941-м па радыё савецкіх людзей віншаваў падобным чынам Міхаіл Калінін, але тады прамова была па-ваеннаму сціслай і стрыманай. З канца 1970-х віншаванні зачытваў дыктар Ігар Кірылаў, і толькі ў 1985-м Міхаіл Гарбачоў вярнуў практыку звароту «ад першай асобы». А напрыканцы 1986-га і 1988-га нават адбыўся смелы эксперымент: жыхароў СССР віншаваў прэзідэнт ЗША Рональд Рэйган, а грамадзян ЗША — Гарбачоў!**

■ Майстар-клас

# Падарункі і ўпрыгажэнні сваімі рукамі

**Прапануем некалькі простых арыгінальных ідэй для стварэння навагодніх цацак. Натхняйцеся, тварыце, выкарыстоўвайце вашу фантазію, каб свята запоўнілася яркімі прыемнымі момантамі.**

### Ёлачка з папяровых палосак

*Матэрыялы: канус з кардону (можна зрабіць самастойна), каляровая двухбаковая папера, алоўак, клей, зорачкі для ўпрыгожвання верхавінкі (таксама можна зрабіць самім).*

Нарэжце з каляровай паперы палоскі, накруціце іх на алоўак. Зрабіце такіх трубачак пабольш. Цяпер бярыце па адной трубачцы і прыклейвайце да конуса. Пачынайце клеіць знізу. Упрыгожце верхавінку.

### Калядны вяночак

*Матэрыялы: трывалы кардон (пажадана не з гладкай паверхняй), макаронныя вырабы «банцікі» (каля 20—30 шт.), фарба-аэразоль, стужка (40 см) шырынёй 7—9 мм, упрыгажэнні (пацеркі, маленькія шарыкі, фігуркі), цыркуль (або розных памераў накрыўкі ці спадачкі), нажніцы, клей (лепш клеявы пісталет).*



Цыркулем начарціце дзве акружнасці дыяметрам каля 10 см (знешняя) і каля 7 см (унутраная). Зрабіць гэта можна і пры дапамозе дзвюх накрывак рознага памеру. Шырыня паміж акружнасцямі 1—1,5 см. Выражце па знешнім і ўнутраным контуры колца. Пры дапамозе клею па ўсёй акружнасці шчыльна прыклейце макарону «банцікі». Гэтак жа прыклейце другі рад, толькі ў шахматным парадку.

У памяшканні, якое добра праветрываецца, нанясіце фарбу-аэразоль на ўсё колца. Дайце добра высахнуць. Абкруціце вяночак стужкай, пакінуўшы каля 10 см стужкі, каб зрабіць пятлю для падвешвання. Стужку ўпрыгожце зорачкамі, пацеркамі, шарыкамі на свой густ.

### Папяровыя сняжынкі

*Матэрыялы: белая папера, канцылярскі нож (нажніцы), клей, шыла ці драўляная шпажка.*







Выраб сняжынак са скручаных палосак паперы (такая тэхніка называецца квілінг), дазваляе перадаць іх лёгкі ажурны малюнак. Нарыхтаваныя дэталі можна прыклеіць на аснову, якую выкарыстаць для вырабу паштовак і пано, а можна склейваць паміж сабою, каб павесіць на ёлачку дзівосныя карункавыя ўпрыгажэнні.

Для выканання гэтых работ нарэжце паперу на палоскі шырынёй 5 мм па кароткім боку. Рэзаць лепш канцылярскім нажом па лінейцы па некалькі лістоў адразу. Для невялікай колькасці падыдуць і нажніцы. Скручваць палоскі можна рознымі інструментамі, аднак лепш за ўсё скарыстаць драўляную шпажку. Каб зрабіць сняжынку (падвеску ці аплікацыю), трэба падрыхтаваць розныя формы са скручаных палосак. Формы могуць быць закрытыя (склееныя) і адкрытыя, дзе клей не выкарыстоўваецца. Для аплікацыі падыдуць і першыя, і другія. А для сняжынкі-падвескі можна выкарыстаць толькі закрытыя формы.

### Навагоднія сэрцайкі

*Матэрыялы: цвёрды кардон, чырвоныя ніткі, нажніцы, прыгожая тасьма, пацеркі, бісер.*

Абвядзіце па шаблоне сэрца на цвёрдым кардоне і абматайце ніткамі. Вось і ўсё. Дадаткова сэрцайка можна дэкарыраваць рознакаляровымі гузікамі, пацеркамі, бісерам. Прымацуйце тасьму і павесьце на ёлку. А калі вы зробіце некалькі такіх сэрцайкаў, збярыце іх у выглядзе гірлянды.



### Цацкі з цеста

Можна прыгатаваць смачныя пернікі і ўпрыгожыць каляровай глазурай і прысыпкай, а можна зрабіць неядомыя цацкі з салёнага цеста, якое трэба падсушыць у духоўцы і расфарбаваць пры дапамозе гуашы.

■ Фотаздымак з гісторыяй

# ПАМЯЦЬ ЧАСУ НЕПАДУЛАДНАЯ

**«Каштоўнасць сямейных адносін пачынаеш разумець з гадамі, — разважае ў лісце чарговы ўдзельнік конкурсу Валерый ГАЎРЫШ з г.Чавусы. — На жаль, у сучасным нашым грамадстве аўтарытэт сям'і парушаны, аб чым сведчыць і колькасць разводаў, якая, паводле статыстыкі, стабільна высокая, і мноства шлюбаў без рэгістрацыі, так званага сужыцця, а з майго погляду — звычайны блуд; і колькасць адзінокіх старых, нашых жа бацькоў, якія ў лепшым выпадку знаходзяць прытулак і спачын у дзяржаўных установах-інтэрнатах... Трэба наноў ствараць культ сям'і!»**



Вырашыў зрабіць свой унёсак у гэту вялікую справу і сам Валерый Мікалаевіч — праз удзел у конкурсе і магчымае абуджэнне цікавасці ў маладзейшага пакалення да старых, архіўных фотаздымкаў з сямейных альбомаў.

«Мая маці Гаўрыш (Пятрова) Таццяна Архіпаўна ў 1943 годзе 15-гадовай дзяўчынай была прымушана акупантамі разам з іншай моладдзю капаць акопы. У 1944 годзе гэтых вязняў вызваліла наступаючая Чырвоная Армія, але дадому ўсіх не адправілі — старэйшых і здаравейшых пакінулі ў якасці вольнанаёмных пры часці, на гаспадарчых работах. Маці ўзгадвала, што працавала на кухні, пасвіла коней, мыла салдацкае абмундзіраванне... Перамогу сустрэла на тэрыторыі Германіі, дзе яе разам з сяброўкамі і аднапалчанамі і сфатаграфаваў ваенны карэспандэнт. На гэтым здымку мая маці — у цэнтры.

А на другім фота яна ўжо разам з маім бацькам, Мікалаем Васільевічам Гаўрышам. Палтаўскі хлопец з 1943 года ўдзельнічаў у разгроме фашызму, быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі і медалём «За адвагу». Дзе менавіта адбылася іх сустрэча і калі палтаўскі парубак, гвардыі радавы Мікола «паклаў вока» на беларуску Таццяну, мне невядома. Маці адразу пасля Перамогі вярнулася ў родную вёску на Магілёўшчыне, а тата яшчэ нейкі час служыў у войску, але пасля дэмабілізацыі знайшоў упадабаную дзяўчыну, і яны ўзялі шлюб, нарадзілі мяне і брата. Іх ужо няма на свеце, маіх дарагіх бацькоў, таты — 28 гадоў, маці — 4 гады; але я ў адказе перад іх памяццю. Як шмат хачу бы ў іх распытаць і данесці гэтыя аповеды ўнукам, пляменнікам, наогул моладзі! А ўжо, як кажуць, цягнік сышоў — трэба спяшацца размаўляць са сведкамі тых вялікіх падзей, пакуль яны жывуць сярод нас.

Сёння зноў нацызм то там, то тут уздымае галаву. І зноў рвуцца снарады, гінуць людзі. Ці за такую будучыню ваявалі нашы бацькі? Няхай жа гэтыя здымкі і каментар да іх прымусяць задумацца аб галоўных каштоўнасцях нашага кароткага зямнога веку — аб міры, сям'і і дзецях, узаемаразуменні, стваральнай працы, наогул, аб самім чалавеку, незалежна ад яго нацыянальнасці, колеру скуры і веравызнання, — усіх чытачоў «Звязды».

* * *

Паважаныя чытачы! Конкурс «Фотаздымак з гісторыяй» працягваецца. Мы па-ранейшаму чакаем ад вас цікавых фота з сямейнага альбома (за выключэннем леташніх здымкаў з курорта, вясельных фотасесій і сучасных фота дзяцей). Вам ёсць што паказаць і расказаць? Давайце пагартаем сямейныя альбомы разам! Фотаздымкі з гісторыяй (не больш за тры) дасылайце на адрас: *220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, або info@zvyazda.minsk.by*. Аўтар найлепшага фота з гісторыяй будзе адзначаны прызам. Арыгіналы дасланых фотаздымкаў абавязкова вяртаюцца аўтарам.



■ Пясочніца

## СВЯТОЧНАЯ ПРЫКМЕТА

— Глядзі, глядзі! — узбуджана цягне бабулю за рукаў 3-гадовы Вова. — Ёлку якую прыгожую паставілі на плошчы і наельнік надзелі!

## КАБ СМАЧНА ЕСЦІ

— Тата, а што ты ясі? — прыстае з пытаннямі 4-гадовая Даша. — Булачку? О, і я люблю булачку.

— Даша, у цябе ж глазураваны сырок ёсць.

— А я і сырок люблю. А яшчэ, ведаеш, я люблю вунь тыя цукеркі!

— Трэба есці адналу і ў цемры, — у роспачы канстатуе тата, назіраючы, як ласункі адзін за адным «уплываюць» да дачкі. Малая, не перастаючы жаваць:

— Так сумна ж будзе!

## НУ, ВЫ МЯНЕ ЗРАЗУМЕЛІ

У госці да Кацінай мамы прыйшла сястра з сынам. Пакуль малыя гарэзяць у пакоі, жанчыны спакойна п'юць чай на кухні. Тут прыбягае запыханая Каця:

— Цётачка Люда, ваш Дзімка на мяне ўвесь час падае! А ён такі цяжкі, цэлых дваццаць... кіламетраў!

## МАЦЯРЫНСКІ ІНСТЫНКТ

— Што вы сёння ў садку рабілі?

— Гулялі з Верай, Сашай і Соняй у дочкі-маці.

— Гэта як?

— Ну, Вера была дачка, Саша — яе мама, я — хросная мама, а Соня — запасная мама.

## ДЫК ВОСЬ ЯНА ЯКАЯ...

Таня перамешвае пясок з вадой з лужыны і палівае гэтым брудам лавачку. Мама абурана пытаецца:

— Таня, чым ты займаешся?

— Палітыкай, — адказвае дзяўчо.



## УСПАМІН

■ Верш з канверта

*Кладачка на рэчцы,*
*Дошкі, як бурштын...*
*Ажывілі ў сэрцы*
*Светлы ўспамін.*

*Нібы зноўку чую*
*Я рыштунку звон:*
*Нештачка майструе*
*Любы дзед Сазон.*

*— Як з душой ды з толкам,*
*Дык і справа йдзе, —*
*Дзед са мной гаворку*
*Шчырую вядзе. —*

*Я табе, унучка,*
*Грабелькі раблю.*
*Грэбці будзе зручна.*
*Зараз во прыб'ю,*

*Прыхаплю цвічкамі,*
*Ты адно — трымай.*
*Грэбсці будуць самі,*
*Толькі паспявай.*

*Я такіх нямала*
*За жыццё зрабіў...*
*Добра патрымала,*
*Роўненька прыбіў.*

*Кучкай на калодцы*
*Ссыпаны цвікі.*
*Лоўка ходзяць пальцы*
*Жылістай рукі...*

*Успамін ліецца*
*На душу цяплом.*
*І жывы, здаецца,*
*Любы дзед Сазон.*

**Валянціна КОЗЫР**, *г. Мінск.*




## Дапамажы пасадзіць кветачкі ў вазон



## Знайдзіце 10 адрозненняў



## Загадкі

**Пад хвоямі,**
**Пад смолкамі,**
**Па лясных дарожках**
**Бяжыць Клубок з іголкамі**
**На кароткіх ножках.**

*(Вожык)*

* * *

**Не пытайся ў мамы,**
**Сам гавары:**
**Хто бегае над намі**
**Нагамі дагары?**

*(Муха)*

* * *

**Мяне ўсе просяць,**
**Мяне чакаюць,**
**А як толькі з'яўлюся,**
**Хавацца пачынаюць.**

*(Дождж)*

## 3D малюнак



**Вядучая рубрыкі Алена БІЗУНКОВА.**

*У народзе кажуць: «ПАЖАНІЛІСЯ, ЯК МАЛАДЫ КОНЬ І СТАРЫ ВОЛ СПРЭГЛІСЯ».*

**Адказная за выпуск Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

## Мікіта СУТЫРЫН:

# «Люблю дакументальнае кіно за тое, што ніколі не ведаеш, дзе цябе падпільнуе яркі кінематаграфічны вобраз»

**Разабрацца ў паняцці «мастацтва кіно» — тое ж самае, што знайсці сэнс жыцця. Але ж калі пошукі сэнсу жыцця ніколі не спыняліся, то і спробы зразумець, у чым заключаецца сутнасць мастацтва кіно і яго адрозненне ад кінапрадукту, маюць права на існаванне.**

**У гэтых пошуках да нас далучаюцца людзі са свету кінематографа. Яны раскажуць пра сваю працу, сваё бачанне кіно, пра метафізічнае і рэальнае, пра сусветнае і вузкасацыяльнае, пра важнае і банальна простае. І таксама, як пасля добрага кіно мы становімся іншымі людзьмі, магчыма, гэтыя інтэрв'ю дапамогуць нам аддаліцца ад нязручных сацыяльных умоўнасцяў.**

**Мікіта Сутырын з пакалення сучасных рэжысёраў-дакументалістаў — жыве ў мастацтве, у якім трэба «выжываць» — шукаць грошы на свае праекты, магчымасці ўвасаблення сваіх задумак, таленавітых людзей, якія змогуць у гэтым дапамагчы. Апроч іншага, Мікіта — віцэ-прэзідэнт Гільдыі неігравога кіно і тэлебачання Расіі, з якой апантана папулярызуе мастацтва дакументальнага кіно, працуе як прадзюсар (якіх у расійскай індустрыі неігравога кіно не хапае). На кінафестываль «Лістапад» Мікіта Сутырын прыехаў з Масквы, каб стаць членам журы конкурсу нацыянальных кінашкол. Пра ўражанні ад праграмы сучаснага маладога кіно я спытала ў першую чаргу.**



— Я з цікавасцю паглядзеў конкурс, некалькі работ мяне зачапіла. Мы аднагалосна вызначылі два лепшыя фільмы, затое потым ламалі коп'і, спрачаліся аб тым, каму даць статуэтку, а каму — дыплом. У выніку вырашылі даць галоўную ўзнагароду фільму «Быць мной, быць табой» аб хлопцы з сіндромам ДЦП. Шчыра кажучы, мяне нячаста закранаюць карціны пра людзей з абмежаванымі магчымасцямі. У многіх з іх мне не хапае гуманізму — аўтары часта ціснуць на шкадаванне замест таго, каб даследаваць свет асобы і праз гэта даваць гледачу магчымасць палюбіць яе, зразумець каштоўнасць і асаблівасць такіх людзей. Праца ж Аляксандры Каўфман падкупіла мяне вельмі асабістым, датычным падыходам да тэмы, што не перашкодзіла аўтару выбудаваць нетрывіяльную і вельмі асэнсаваную драматургію фільма. Другую карціну — «Ад панядзелка да панядзелка» з Грузіі — мы адзначылі дыпломам Гільдыі неігравога кіно.

**— Вы прыйшлі ў дакументальнае кіно з журналістыкі. Гэта неяк звязана?**

— Для мяне журналістыка стала своеасаблівай тактыкай пазнання свету. Мне былі цікавыя людзі, падабалася задаваць пытанні, супастаўляць факты, аналізаваць, рабіць высновы — увогуле мне падабалася працаваць журналістам. Для мяне гэты вопыт быў важнай жыццёвай школай. У Екацярынбургу, адкуль я родам, даволі развітая культура неігравога кіно. У 1990-я на Урале, ды і ва ўсёй Расіі, кіно знаходзілася ў заняпадзе, але ў дакументалістыцы жыццё было — у асноўным на Свярдлоўскай кінастудыі, трохі — на рэгіянальных тэлеканалах і нашым журфаку. Тады ўжо збіраў поўныя залы фестываль неігравога кіно «Расія». І мы, маладыя журналісты, глядзелі, абмяркоўвалі, пісалі пра гэта, асвойвалі, акрамя традыцыйных журналісцкіх жанраў, кінамову... Я быў адным з тых, хто ў выніку захацеў сябе ў гэтым паспрабаваць — і паехаў паступаць у ВГІК. Паступіў.

**— Пяць гадоў навучання ў традыцыйнай ВНУ, сапраўды так важныя для рэжысёрскай працы?**

— У кожнага свой шлях у кіно. Нехта мінуў профільную адукацыю або ВНУ наогул, і гэта не значыць, што ён — менш «добры дакументаліст». Зараз гэта, напэўна, прагучыць пафасна і нясціпла, але для мяне ВГІК стаў стратэгічным плацдармам для асваення прафесіі, для ўсведамлення сябе кінематаграфістам, для заваёўвання Масквы, нарэшце. А калі сур'ёзна — пяць гадоў у ВГІК — гэта ж не толькі лекцыі і семінары, але і жыццё ў інтэрнаце — своеасаблівым «плавільным катле» кінематаграфістаў, і міжнародны студэнцкі кінафестываль, і магчымасць здымаць сваё кіно на базе вучэбнай кінастудыі.

Памятаю, як на другім курсе, адразу ж пасля здымак дэбютнага фільма, адправіўся здымаць у Нідэрланды з цалкам замежнай, галандскай камандай. Уявіце, мне 22 гады, я ўпершыню за мяжой, англійскай толкам не ведаю і павінен за 10 дзён зняць кіно на невядомую пакуль тэму.

А яшчэ праз паўгода — Аранжавая рэвалюцыя ва Украіне. Грошай ні капейкі, а трэба ехаць, усімі думкамі там. Упісаўся назіральнікам на выбары, на аўтобусах дабраўся да Кіева, на аматарскую камеру зняў кароткаметражку «Танцы на Майдане»... Увогуле, ВГІК для мяне — гэта нават не адукацыя, а нешта з катэгорыі lifestyle. Табе на 5 гадоў даецца дах над галавой, магчымасць здымаць, разбіраць сваё кіно ў лабараторыі з педагогамі, эстэтычнымі апанентамі і аднадумцамі.

> **У 1990-я на Урале, ды і ва ўсёй Расіі, кіно знаходзілася ў заняпадзе, але ў дакументалістыцы жыццё было — у асноўным на Свярдлоўскай кінастудыі, трохі — на рэгіянальных тэлеканалах і на журфаку.**

**— У Мінску вы казалі, што Гільдыя неігравога кіно і тэлебачання працуе для таго, каб зрабіць індустрыю дакументальнага кіно больш адкрытай, зразумелай, цікавай для гледача. У чым заключаецца гэтая праца? Вы прапанавалі супрацоўніцтва беларускім кінематаграфістам ад імя Гільдыі неігравога кіно...**

— Нам цікава пазнаёміцца з беларускімі калегамі — рэжысёрамі, пракатчыкамі і аматарамі дакументальнага кіно. Шэраг нашых праектаў можа знайсці лагічны працяг і на постсавецкай прасторы, у тым ліку ў Беларусі.

Напрыклад, Нацыянальная кінаклубная сетка. Кінаклубны рух наогул — цікавая з'ява. Ва ўмовах, калі дакументальнае кіно практычна выключана з камерцыйнага пракату, кінаклубы — гэта ініцыятыва знізу, альтэрнатыва вялікім кінатэатральным паказам, гэта ўвасабленне намеру гледачоў не проста глядзець кіно, але і «пражываць» яго разам, абмяркоўваць пасля сеанса, дзяліцца ўражаннямі, задаваць пытанні. За мінулы дзясятак гадоў у розных гарадах Расіі адкрылася нямала такіх пляцовак — тэматычныя, студэнцкія, тэрытарыяльныя і г.д. У нашай базе даных такіх больш за 160. Часта гэта клубы, якія працуюць на голым энтузіязме, бяруць фільмы з торэнтаў, а іншы раз прадаюць на такія сеансы квіткі.

І вось Гільдыя прыдумала механізм працы з такімі пляцоўкамі, каб гэтыя ўстановы паказвалі кіно і пры гэтым не парушалі закон. Многія члены Гільдыі перадаюць нам правы на дыстрыбуцыю сваіх фільмаў. Мы, у сваю чаргу, прапануем гэтае кіно кінаклубам. Прычым Гільдыя гарантуе — гэта цалкам легальны кантэнт, дзе загадзя вырашаны ўсе бюракратычныя фармальнасці. Кінаклубу застаецца толькі падпісаць з Гільдыяй партнёрскае пагадненне, стаць нашым падпісчыкам і атрымаць доступ да каталога нашых фільмаў.

**— У сучасных умовах складана рэалізоўваць магчымасці аўтарскага дакументальнага кіно?**

— Мне здаецца, у нашага брата-дакументаліста аформілася нейкая патэрналісцкая залежнасць ад сродкаў, якія вылучае Міністэрства культуры. Многія калегі не ўяўляюць свайго кіно без падтрымкі дзяржавы, а гэта не адзіная крыніца фінансавання для неігравога кіно. Ёсць цэлы шэраг фондаў, кінаінстытутаў, арганізацый, якія даюць медыягранты; нарэшце, у вытворчасці ўдзельнічаюць тэлеканалы. Прафесіяналу трэба ведаць, на якіх умовах яны супрацоўнічаюць, як зрабіць свой праект цікавым для тых ці іншых інстытуцый.

Некалькі гадоў таму мы з калегамі пачалі ўдзельнічаць у пітчынгах, дзе трэба ярка, сцісла і выразна прадставіць свой праект тым, хто можа ім зацікавіцца і паўдзельнічаць у вытворчасці твайго кіно. Мы вывучалі альтэрнатыўныя спосабы падтрымкі неігравога кіно, дзяліліся гэтымі ведамі з калегамі па цэху, і сёння пітчынг — усім знаёмая і паўсюдная тэхналогія.

**— Вы працавалі таксама і з тэлевізійнымі праектамі. У чым асаблівасць работы з ТБ-дакументалістыкай?**

— У тэлеіндустрыі ёсць адзін жахлівы тэрмін, ад якога мяне кідае то ў дрыжыкі, то ў рогат — «акарцініваць». Гэта значыць зняць нешта такое, што худа ці бедна падыходзіць па сэнсе, каб закрыць гэтай карцінкай «цагліну» закадравага тэксту.

На шчасце, сказаць, што ўсё наша тэлебачанне займаецца «акарціньваннем», нельга. Але ў цэлым, ТБ-дакументалістыка — гэта дыктат фармату, формы, выразнага канона ў падачы інфармацыі. Калі аўтарскае кіно імкнецца максімальна наблізіцца да жыцця, мінімізаваць аб'ём закадравага тэксту як відавочнага інструмента маніпуляцыі, то ўявіць у эфіры цэнтральных каналаў дакументальнае кіно без закадравага голасу — практычна немагчыма. Вербальная перадача сэнсу тут дамінуе над сэнсам выяўленчым, над візуальнымі вобразамі, кінамовай. Таму і апошняе слова на ТБ, як правіла, за рэдактарам, а не за рэжысёрам.

> **Вербальная перадача сэнсу ў ТБ-дакументалістыцы дамінуе над сэнсам выяўленчым, над візуальнымі вобразамі, кінамовай. Таму і апошняе слова на ТБ, як правіла, за рэдактарам, а не за рэжысёрам.**

Трэба аддаць належнае: на студыях, дзе ў прамысловых маштабах выраблюць тэлевізійныя фільмы, можна спрабаваць новую апаратуру, адточваць эксперыментальныя і тэхналагічна складаныя здымкі.

**— Вы выпрацавалі тэхналогію «дакументальны дэсант» — прыязджаеш на ўмоўнае месца, знаходзіш тэму і здымаеш фільм. А ці не трэба спачатку «выносіць» ідэю, прадумаць яе ўвасабленне, каб вынік не аказаўся штучным?**

— У кожнага рэжысёра свой тэмперамент і свае адносіны з рэальнасцю. Нехта выношвае кіно гадамі, перш чым узяцца за камеру, а нехта выдае па фільме ў год і так выпрацоўвае стыль, шліфуе і адточвае свае навыкі. Я люблю дапускаць долю спантаннасці — ніколі не ведаеш, дзе натыкнешся на дакладную і пранізлівую сітуацыю, ёмістую і празрыстую метафару, якую бяры і здымай. Ці наадварот: запланаваў, зняў, а рэчаіснасць аказалася ў тваім кадры зусім іншай... Мне падабаецца знаходзіцца ў стане творчага палявання. Працуючы на ТБ, я спецыяльна развіваў у сабе ўменне прымаць рашэнні аператыўна, на месцы, без папярэдняга агляду. Часта ў экспедыцыях і на складаных аб'ектах прыходзіцца працаваць ва ўмовах жорсткага таймінгу, і тады ўменне не разгубіцца і выдаць годны вынік без падрыхтоўкі неабходны.

**— Што такое мастацтва кіно, у адрозненне ад камерцыйнага, глядацкага кіно?**

— У Хлебнікава ёсць такі верш: «Мне мала надо. Краюшку хлеба и каплю молока. Да это небо, да эти облака». Можа, я не такі аскетычны, як гэты футурыст-бяссрэбранік, але ў цэлым выдатна разумею, што дакументальнае кіно — не самая грашовая індустрыя. Мяне зусім не бянтэжаць «балты ў тамаце» — так на старым кіношным арго называліся заказныя фільмы. Леанарда да Вінчы і Мікеланджэла рабілі махровую «заказуху», але каму гэта цяпер цікава — значна важней тое, што гэтымі працамі яны навечна ўпісалі сябе ў гісторыю сусветнага мастацтва. А тое, што яны гэтым яшчэ і на жыццё зараблялі, — дык гэта мара любога мастака. Мастацтва для мяне — гэта магчымасць выказвацца, быць пачутым, застаючыся пры гэтым самім сабой. Для мяне ўсякае сапраўднае мастацтва — сучаснае, гэта праца тут і цяпер, нельга здымаць для вечнасці. Мне, як дакументалісту, важна захаваць момант, а таксама ўбачыць вочы гледача пасля маіх фільмаў, адчуць яго рэакцыю, пагаварыць з ім пасля паказу, атрымаць аддачу. А як будзе ацэньвацца тое, што я зрабіў праз гады ці стагоддзі, — цікава, вядома, але ўжо не так важна.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**


## ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении 23 декабря 2014 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ЗАО «Торговый Дом «Луч-М»

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (сведения о продаваемом имуществе)** | **Капитальное строение с инвентарным номером 500/С-3492 общей площадью 1005 кв.м, расположенное по адресу: г. Минск, пер. Тучинский, д. 4 (наименование: Здание торгового дома (литер А 3/К); назначение: здание торгового дома)** |
